Турызм ёсць, брэндаў не хапае

СТАР. 3

Мужчына заўсёды жадае і заўсёды гатовы?

СТАР. 5

Тры рублі адной манетай

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. СЕРАДА № 117 (27727) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЧЭРВЕНЬСКАЕ ЗБОЖЖА

Фота БЕЛТА.

У старшага камбайнера КСУП «Малажынскі» Брагінскага раёна Івана ХАДЗЬКО і яго калег гарачая пара жніва пачалася сёлета ў чэрвені: у самым паўднёвым рэгіёне Гомельшчыны пачалі ўбіраць азімы ячмень. У «Малажынскім» ён пасеяны на 130 гектарах. Ураджай, хоць і надзвычай ранні, але неблагі: у першыя дні з кожнага гектара малоцяць у сярэднім па 37 цэнтнераў збожжа.

СУХІ ПОРАХ ПЛЮС МАДЭРНІЗАЦЫЯ

Краіне патрэбна мабільная армія з эфектыўным узбраеннем

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў, наведваючы ў Барысаве прадпрыемствы абароннага сектара. Прэзідэнту, у прыватнасці, было даложана аб арганізацыі вытворчасці ў Беларусі шматмэтавага поўнапрываднага аўтамабіля, які можа абсталёўвацца рознымі модулямі і перавозіць да 12 чалавек, паведамляе БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

На думку кіраўніка дзяржавы, у сучасных умовах «мабільная тэхніка важнейшая, чым танкі, самалёты і іншае». «Нам патрэбны гэтыя мабільныя шматмэтавыя машыны, каб мы маглі ў любы час паехаць куды трэба і нанесці непапраўную шкоду таму, хто сюды палезе. Трэба паскорыцца», — паставіў задачу беларускі лідар.

Як далажылі Прэзідэнту, плануецца, што лакалізацыя пры вытворчасці адпаведнай тэхнікі будзе дасягаць 85%. Акрамя таго, у гэтым годзе ў Беларусі таксама адкрыецца прадпрыемства па вытворчасці ўласных гранатамётаў.

Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання ў Барысаве ААТ «140-ы рамонтны завод» таксама паставіў задачу стварыць айчынную бронемашыну. «Вы павінны прыдумаць самую сучасную бранятэхніку для сучаснага бою. Якую, вы ведаеце лепш за мяне: у вас ёсць уласны і вы вывучаеце сусветны вопыт. У бліжэйшы час вы павінны зрабіць гэтую машыну, за якой стаялі б у чарзе людзі, гатовыя купіць яе за мяжой», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў сучасным свеце не менш запатрабаваны і паслугі па рамонце і мадэрнізацыі рознага ўзбраення. Паводле слоў Прэзідэнта, па адпаведным шляху ідзе і Беларусь, мадэрнізуючы танкі і самалёты, іншае дарагое ўзбраенне, забяспечваючы яго самым сучасным начыннем і даводзячы па сваіх характарыстыках да самых сучасных узораў.

Прэзідэнт станоўча ацаніў і той факт, што, акрамя патрэб абароннага сектара, прадпрыемства таксама выконвае работы для сферы народнай гаспадаркі: рамантуе і мадэрнізуе чыгуначную тэхніку, дызельныя рухавікі, вырабляе ўсюдыходную, аварыйна-выратавальную і спецыяльную пажарную тэхніку. «Усё трэба рабіць, што вы можаце і за што плацяць грошы. Так паступаюць ва ўсім свеце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У час наведвання завода па рамонце радыёэлектроннага ўзбраення Прэзідэнту было даложана аб арганізацыйна-вытворчай структуры, фінансава-гаспадарчай дзейнасці і перспектывах развіцця завода, а таксама аб рабоце, якую праводзяць па стварэнні беларускага зенітнага ракетнага комплексу. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што, акрамя рамонту і мадэрнізацыі тэхнікі, адпаведныя прадпрыемствы павінны паступова падыходзіць да стварэння новых сучасных узораў узбраення. «На гэтай базе трэба стварыць свой комплекс, і ён павінен быць не горш за С-300. Таму вы думайце, якая ў яго будзе ракета. Галоўнае, каб яна была эфектыўнай і паражала любую цэль. Усе заводы пачыналі калісьці з рамонту, потым займаліся мадэрнізацыяй, а потым выходзілі на ўласныя ўзоры», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Ваша задача — атрымаць тут новую сучасную зброю для нашай абароны і для рэалізацыі на экспарт», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Што тычыцца айчыннага зенітна-ракетнага комплексу, Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу, каб гэтым пытаннем займалася не адно прадпрыемства ці нават ведамства. Адпаведная задача павінна рэалізоўвацца сумеснымі намаганнямі пры ўдзеле ўсіх зацікаўленых.

СТАР. 2

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

26 чэрвеня 2014 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца заключнае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Спрэчнае пытанне

ШКОЛА НА ЗАМКУ

За апошнія 20 гадоў на Магілёўшчыне зачынілася кожная другая сельская ўстанова адукацыі

Дырэктар Ганчанскай школы, што на Клічаўшчыне, Зоя Мельнікава не ўтойвае: ёй нялёгка будзе прывыкнуць да таго, што той установы, якой яна аддала амаль 50 гадоў свайго жыцця, больш не будзе. Калі былыя выпускнікі пачалі ёй тэлефанаваць, каб спытацца, куды ж цяпер прыязджаць на вечары сустрэч, яна не ведала, што ім адказаць. Дамовіліся, што сустрэнуцца недзе непадалёку ад будынка. Школы там больш няма, а таму прайсціся па яе «ціхіх паверхах», як пяецца ў вядомай песні, не атрымаецца...

ПРАЦЭС ПАЧАЎСЯ НЕ ЎЧОРА...

Калісьці Ганчанская школа была адной з лепшых у Беларусі, яна нават занесена ў ганаровую кнігу Міністэрства адукацыі БССР. А мастацкія вырабы яе вучняў, якія займаліся ў творчым аб'яднанні пры школе, ведалі не толькі на радзіме, але і ў Маскве. У канцы мінулага стагоддзя яны выстаўляліся на вядомай Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі і былі адзначаны бронзавымі медалямі. Неверагодна, але калісьці тут налічвалася да 500 вучняў. Сёлета засталося усяго...12. Не сакрэт, што калі б працавала тое торфапрадпрыемства, якое калісьці квітнела, такога б ніколі не адбылося.

Двухпавярховы мураваны будынак уражвае, нават не верыцца, што ў ім больш не загучаць дзіцячыя галасы. Але лёс яго ўжо вырашаны. Апошні званок прагучаў 31 мая адразу для ўсіх — і для школьнікаў, і для настаўнікаў. Таму слёз не хаваў ніхто.

Такі лёс напаткаў не адну толькі Ганчанскую школу. На Магілёўшчыне з 1 верасня плануецца зачыніць 18 вучэбных устаноў, у тым ліку 5 вучэбна-вытворчых камбінатаў. Пад аптымізацыю трапілі школы, дзе колькасць вучняў — меншая за 25. Нейкіх класаў там няма наогул, а ў некаторых усяго па 1-3 вучні.

Але працэс скарачэння малакамплектных школ пачаўся не ўчора. Па звестках упраўлення адукацыі аблвыканкама, за апошнія 20 гадоў толькі ў сельскай мясцовасці было зачынена больш за 250 школ, практычна кожная другая. А колькасць вучняў на Магілёўшчыне скарацілася з амаль 179 тысяч (у 1993 годзе) да 105 тысяч (у 2013-м).

СТАР. 3

■ Наша гісторыя

ВЯРТАННЕ КНЯЗЯ

У Віцебску, дзе напрыканцы гэтага тыдня будуць святкаваць 1040-ю гадавіну заснавання горада, адкрыюць помнік князю Альгерду

Помнік унікальны для Віцебска і тым, што гэта будзе першая конная статуя. Яна з'явіцца ў цэнтры горада недалёка ад будынка ратушы. Некаторыя гараджане выказвалі сумненні: навошта, маўляў, увекавечваць памяць князя, які «ваяваў з рускім войскам, на Маскву хадзіў»? Мы ж з Расіяй — саюзнікі і актыўна супрацоўнічаем у рамках Саюзнай дзяржавы...

Па каментарый карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да **Анатоля ДУЛАВА, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, загадчыка кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.**

— Бацькам Альгерда, князя Крэўскага і Віцебскага, вялікага князя Літоўскага, быў вялікі князь літоўскі Гедымін, пры якім Вільня стала цэнтрам збірання ўсходнеславянскіх земляў.

Фота БЕЛТА.



СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ:

«З пачатку года ў вобласці на вадзе загінулі пяцёра дзяцей. У пераважнай большасці няшчасныя выпадкі адбыліся ў прысутнасці бацькоў або блізкіх сваякоў. Гэта нармальныя сем'і, дарослыя знаходзіліся ў цвярозым стане, загаралі або лавілі рыбу. Складваецца адчуванне, што мы распесцілі бацькоў, якія прывыклі, што дзеці знаходзяцца пад пастаянным наглядам педагогаў, міліцыі, выратавальнікаў, медыкаў і работнікаў культуры. Бацькі проста забыліся, што дзецьмі трэба займацца. Гэта і прыводзіць да трагедый».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.06.2014 г.

Долар ЗША	10180,00	■
Еўра	13850,00	▲
Рас. руб.	299,50	▲
Укр. грыўня	856,90	▲

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЛІТВУ АБАВЯЗАЛІ ВЯРНУЦЬ ГЕРМАНІІ КАРЦІНЫ НА ПАЎМІЛЬЁНА ЕЎРА

Вярхоўны суд Літвы абавязаў улады рэспублікі вярнуць Германіі палатно італьянскага мастака Антоніа Кампі «Тры Марыі каля магілы Хрыста», якое было незаконна вывезена адтуль пасля Другой сусветнай вайны. Акрамя таго, як паведамляе DELFI, суд пацвердзіў рашэнне ніжэйшай інстанцыі, паводле якога Літва павінна перадаць Фонду прускіх культурных каштоўнасцяў палатно нямецкага жывапісца Адольфа Менцэля «Раніца папялістага дня». Кошт абедзвюх карцін, выстаўленых у Літоўскім музеі мастацтваў, паводле інфармацыі выдання, ацэньваецца ў два мільёны літаў (амаль 580 тысяч еўра). Цяжба паміж Літвой і Германіяй з нагоды гэтых палотнаў доўжылася больш за восем гадоў.

ПУЦІН ПРАПАНАВАЎ АДМЯНІЦЬ РАШЭННЕ АБ ВЫКАРЫСТАННІ АРМІІ ВА УКРАІНЕ

Прэзідэнт Расіі прапанаваў Савету Федэрацыі адмяніць пастанову аб выкарыстанні Узброеных сіл РФ на тэрыторыі Украіны ў сувязі з пачаткам трохбаковых перамоў па пытанні ўрэгулявання сітуацыі ва ўсходніх рэгіёнах Украіны. Сваю прапанову расійскі лідар абгрунтаваў неабходнасцю нармалізацыі становішча ў рэгіёне. Пытанне аб адмене пастановы будзе разгледжана на пленарным пасяджэнні Савета Федэрацыі 25 чэрвеня. Нагадаем, 1 сакавіка члены Савета Федэрацыі дазволілі кіраўніку дзяржавы выкарыстоўваць ва Украіне войскі. Рашэнне было аформлена пастановай верхняй палаты парламента аб дачы згоды «на выкарыстанне Узброеных сіл РФ на тэрыторыі Украіны да нармалізацыі грамадска-палітычнай сітуацыі ў гэтай краіне».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

17 ТЫСЯЧ УКРАІНСКІХ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ ЗВОЛЬНЕНЫ ЗА ПАРУШЭННЕ ПРЫСЯГІ

Амаль 17 тысяч міліцыянераў звольнены з МУС Украіны за парушэнне прысягі. Такія даныя прывёў намеснік кіраўніка міністэрства Сяргей Чабатар, не ўдакладніўшы, за які перыяд былі зроблены звальненні. «Мы ўсё робім для таго, каб сапраўды асобы, якія парушаюць закон, не працавалі ў МУС. Тут не можа быць з імі ніякіх кампрамісаў», — заявіў Чабатар. Намеснік міністра прывёў даныя, паводле якіх звальненні супрацоўнікаў у Хмяльніцкай, Херсонскай, Чарнігаўскай, Харкаўскай і Цярнопальскай абласцях адбыліся з-за іх дачынення да карупцыйных схем і наркагандлю. Такія кадравыя рашэнні Чабатар растлумачыў працягам рэфармавання міліцыі.

КОРАТКА

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені — маі 2014 года склала Br5 млн 680,1 тыс. Сярэдняя зарплата ў маі была Br6 млн 55,9 тыс., яна павялічылася ў параўнанні з красавіком бягучага года на 3,3 працэнта, або на Br195,3 тыс.

Аграрыі ўсіх абласцей пачалі нарыхтоўку траў другім укосам. Усяго план другога ўкосу складае 868,1 тыс. га. Па стане на 24 чэрвеня заданне выканана амаль на 11,4 працэнта.

Верталёты Ка-52 і самалёты Су-34 ВПС Расіі прымуць удзел у паветраным парадзе ў азнаменаванне Дня Незалежнасці і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, які пройдзе 3 ліпеня ў Мінску.

На цэнтралізаваным тэсціраванні па рускай і беларускай мовах 40 абітурыентаў атрымалі 100 балаў.

■ Спецыяльны рэпартаж

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ № 2 (2)

РЭФОРМА ВЫПРАЎЛЕННЯ

Як калонія ператвараецца... у лячэбна-працоўны прафілакторый

Да магілёўскай выпраўленчай калоніі №19 вядзе добра ўтрамбаваная коламі аўтамабіляў і пратэктарамі абутку дарога. Больш за 20 гадоў па ёй у выпраўленчую ўстанову везлі асуджаных, а хутка павязуць пастаяльцаў у лячэбна-працоўны прафілакторый. Напрыканцы мая Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ «Аб удасканаленні дзейнасці крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў». Гэты дакумент даў штуршок да рэарганізацыі пэўных выпраўленчых калоній у лячэбна-працоўныя прафілакторыі.

Фота Надзеі БУЖАН.

«БОЛЬШАСЦЬ АСУДЖАНЫХ РАЗЛІЧВАЕ НА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫЗВАЛЕННЕ»

— Цяпер усё знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі выпраўленчай калоніі, — прымае нас у працоўным кабінеце **Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ, выканаўца абавязкаў начальніка выпраўленчай калоніі №19.** — Для гэтага рыхтуюцца неабходныя дакументы, але працэс не такі хуткі, а таму патрабуе пэўнага часу. Большасць зняволеных мы ўжо этапавалі ў іншыя калоніі. У нас засталося каля ста асуджаных. Аднак праз пэўны час іх таксама перавядуць у іншыя месцы пазбаўлення волі. Што тычыцца нашых супрацоўнікаў, большасць з іх працягне працаваць у ЛПП.

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Вы яшчэ паспееце падпісацца на «Звязду» на III квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Індэкс/перыяд	1 месяц	3 месяцы
63850 (для індывідуальных падпісчыкаў)	57 000	171 000
63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў)	51 300	153 900
63858 (для ведамасных падпісчыкаў)	125 000	375 000
63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя)	112 500	337 500

СУХІ ПОРАХ ПЛЮС МАДЭРНІЗАЦЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На сустрэчы з прадстаўнікамі працоўных калектываў прадпрыемстваў абароннага сектара кіраўнік дзяржавы закрануў пытанні, актуальныя для нашага грамадства. Прэзідэнт, у прыватнасці, сказаў:

Аб павышэнні пенсійнага ўзросту

«Людзі не хочуць павышэння пенсійнага ўзросту. Я не магу сёння ісці насуперак волі людзей. Калі, вядома, сітуацыя ўскладніцца і я як эканаміст буду бачыць, што гэта для краіны дрэнна, тады я шчыра вам скажу: ці ў два, або ў тры прыёмы, але давайце на 5 гадоў пенсіі адцягваць. Але пакуль мы такое пытанне перад сабой не ставім і праблему такім чынам вырашаць не збіраемся. Пакуль трываем. Але вельмі цяжка. Калі мы будзем ісці да гэтага, я вам абавязкова сумленна і адкрыта скажу».

Разам з тым, кіраўнік дзяржавы не выключыў магчымасці павышэння пенсійнага ўзросту ў будучыні, патлумачыўшы праблему змяненнем суадносін колькасці працуючых людзей да ліку пенсіянераў.

Аб перасяленцах з Украіны

У кіраўніка дзяржавы пацікавіліся, ці ёсць ахвотныя пераехаць у Беларусь з Украіны і магчымасць іх працаўладкаваць. «Такія людзі ёсць, ахвотных вельмі шмат. Мы адразу ж даручылі пасольству складаць такія спісы, каб гэта было не хаатычна, як часам адбываецца цяпер у Расіі (там ёсць ужо вялізныя праблемы ў лагерах перасяленцаў і бежанцаў). Таму зачыніцца мы ад іх не можам і не павінны: людзі пакутуюць», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Мы гатовы прымаць такіх людзей арганізавана. Нам працоўныя рукі патрэбны. І мы гатовы іх размяшчаць у розных частках нашай краіны, даць ім дах над галавой і месца працы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Аб стабільнасці

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асноўным кірункам яго дзейнасці на прэзідэнцкай пасадзе з'яўляецца забеспячэнне бяспекі дзяржавы. «Ніхто ніколі не даруе Прэзідэнту і ён нічым не апраўдаецца, калі гэтая стабільнасць, якая ў нас ёсць, будзе парушана і мы страцім у тым ліку ваенную бяспеку», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў вялікую важнасць таго факта, што людзі ў Беларусі, напрыклад, могуць спакойна і без страху адпусціць дзяцей на вуліцу. «У нашым свеце гэта ўжо найвялікшае дасягненне. Гэта самае галоўнае, і нам гэта нельга страціць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Літасці нікому не будзе: ні жулікам, ні злодзеям, ні тым, хто перашкаджае нам жыць. Таму давайце разам захоўваць гэтую стабільнасць. Што ад мяне залежыць, я не проста імкнуся — я гэта раблю разам з мужыкамі, якія стаяць у мяне за спінай. Для таго мы і ёсць у дзяржаве, каб абараніць нашы сем'і», — рэзюмаваў беларускі лідар.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ

Прэзідэнт Беларусі ўдастоіў дзяржаўных узнагарод прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў у аўтамабілебудаванні, дарожным будаўніцтве, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, значны асабісты ўклад у развіццё інфармацыйных тэхналогій, аховы здароўя, сацыяльнай абароны насельніцтва, сферы гандлёвага абслугоўвання, дасягненні ў галіне навукі, адукацыі, мастацтва, культуры і спорту. Аляксандр Лукашэнка падпісаў адпаведны ўказ, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

У прыватнасці, ордэнам Айчыны I ступені ўзнагароджаны генеральны дырэктар ААТ «Пеленг» Уладзімір Пакрышкін. Ордэна Айчыны III ступені ўдастоены старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў» Ігар Лучанок, дырэктар ААТ «АГАТ — сістэмы кіравання» — кіруючая кампанія холдынга «Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання» Юрый Масіенка, дырэктар ААТ «558 Авіяцыйны рамонтны завод» Уладзімір Рыбін. Капітан Андрэй Навіцкі пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені. Ордэнам Пашаны адзначаны генеральны дырэктар ААТ «Камінтэрн» Пётр Афончанка, гендырэктар ААТ «ДОРОРС» Пётр Бялоцкі, гендырэктар ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў» Віталь Воўк, дырэктар ААТ «КБ Радар» — кіруючая кампанія холдынга «Сістэмы радыёлакацыі» Сяргей Кастраміцкі, дырэктар ААТ «Вялікі Двор» Стаўбцоўскага раёна Вольга Луцык, дырэктар вытворча-творчага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Дызайн-Студыя сэнс» Уладзімір Трафіменка і дырэктар адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Валерый Цапкала.

Шэраг ваеннаслужачых, супрацоўнікаў правааахоўных органаў і органаў пагранслужбы ўзнагароджаны медалямі «За адзнаку ў воінскай службе», «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку», «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай мяжы». Медалём «За працоўныя заслугі» і медалём Францыска Скарыны адзначаны 49 чалавек.

■ ЖКГ: на скрыжаванні думак

ДЗЕ ЗНАЙСЦІ ДОБРАГА САНТЭХНІКА?

Цяпер шмат гаворыцца пра неабходнасць рэарганізацыі і ўдасканалення камунальнай гаспадаркі. На нарадах, у СМІ выказваюцца розныя думкі і меркаванні. Але я думаю, кардынальна нічога не зменіцца. Магчыма, адбудзецца аптымізацыя колькасці работнікаў, можа, нават больш празрыстай стане сістэма налічэння камунальных паслуг. Кошт іх, несумненна, будзе расці. Але для нас, жыхароў шматпавярховак, у сістэме і змесце абслугоўвання мала што зменіцца. Як жылі мы ў «зоне рызыкі», так і будзем жыць. Зонай рызыкі я называю пастаянную боязь затапіць суседзяў, калі ідзем на працу, тым больш калі з'язджаеш на дачу ці ў водпуск.

У Брэсце не так даўно адзінокі ветэран вайны аказаўся адказчыкам па судовай справе. 87-гадовы дзядуля вярнуўся дадому пасля наведвання паліклінікі і застаў кватэру ў вадзе. Залітымі былі і суседзі паверхам ніжэй. Не, ён не забыўся закрыць кран. Аказалася, разбурылася разьба накрыўкі на фільтры гарачай вады. Гэты фільтр з накрыўкай з'яўляецца часткай вадамернага вузла, які ўстаноўлены ў кухні. Вадамеры ставілі спецыялісты водаканала. Але 20 мільёнаў рублёў за ўрон, нанесены суседняй кватэры, запатрабавалі праз суд з ветэрана. А ў чым яго віна? Вось я і кажу пра вечную зону рызыкі.

У нас няма службы, якая б узяла на сябе клопат пра стан сантэхнікі ў кватэры. Калі ў дамах, што знаходзяцца на абслугоўванні ЖЭСаў, сантэхнікі ўсё ж такі прыходзяць па выкліку, у кааператыўных забудовах такая служба наогул не прадугледжана. Сантэхнік кааператыва абслугоўвае агульныя агрэгаты і вузлы дома. А ў кватэру ён можа прыйсці па запрашэнні за асобную плату, калі будуць у яго адпаведныя настрой і жаданне. У большасці ж выпадкаў жыльцы кааператывaў шукаюць спецыялістаў па рэкамендацыях знаёмых, сяброў, суседзяў. Адзін такі «спецыяліст» прыйшоў да мяне па рэкамендацыі, памяняў шмат чаго ў санвузле, запрасіў шчодры ганарар. А праз суткі ноччу «лопнула» разьба на трубе, вада хлынула вонкі з такім гукам, што гэта было падобна на выбух. Другі, які прыйшоў устараняць аварыю, сказаў, што папярэдні яго калега «моцна зацісnуў і сарваў разьбу яшчэ пры завінчванні». Сантэхнік нашага кааператыва, які таксама мае сілу і габарыты, памяняў адноўчы змяшальнік на ўмывальніку. Пасля таго цяжкі фаянсавы ўмывальнік упаў і разбіўся на кавалкі.

Кожны раз, праклінаючы сантэхніку і сваё няўменне з ёю ўпраўляцца, не разумею, чаму ў нас няма такой службы, як у некаторых краінах. Знаёмыя расказвалі, што ў Германіі заключаеш дагавор, плаціш нешта накшталт страхавых узносаў, і спецыялісты самі наведваюць цябе, праводзяць прафілактыку. Бо ім нявыгадна прыязджаць па выкліку — гэта адмоўна ўплывае на прэмію. Застаецца марыць, што і ў нас будуць гаспадарча-разліковыя брыгады альбо поўнасцю прыватныя, але з добрых слесараў-сантэхнікаў, каб кліент ведаў, што за грошы, няхай і немалыя, зробяць якасна і будуць адказваць за сваю работу. Няўжо гэта такі складаны праект, які зусім нельга ажыццявіць?

…А дома амаль тыдзень няма халоднай вады ў кухні. Бо сантэхнік нашага кааператыва, які каторы дзень абяцае зайсці, адказвае па тэлефоне, што пакуль ён заняты. Занятак заключаецца ў распіванні піва з сябрамі на лаўцы каля пад'езда. З акна відаць.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

ВЯРТАННЕ КНЯЗЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У 1318 годзе Альгерд ажаніўся з дачкой віцебскага князя Яраслава Марыяй. Спачатку маладыя жылі ва Усвяце. Калі ў 1320 годзе князь Яраслаў памёр, Віцебскае княства адышло па спадчыне яго зяцю. Такім чынам, шляхам дынастычнага шлюбу Віцебск і Віцебскае княства ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Відавочна, пры ўступленні на віцебскі прастол Альгерд заключыў з віцяблянамі дагавор па прынцыпе «не рушыці старыны», што прадугледжвала шырокую аўтаномію Віцебскай зямлі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, якая захоўвалася і ў наступныя стагоддзі.

Дзейнасць князя Альгерда была накіравана на ўмацаванне і развіццё горада. У адпаведнасці з найноўшымі еўрапейскімі дасягненнямі Віцебск быў абнесены мураванымі фартыфікацыйнымі збудаваннямі. Каменнымі сценамі з абарончымі вежамі былі ўмацаваны Ніжні і Верхні замкі. У Верхнім замку Альгердам пабудаваны княжацкі палац.

Альгерду прыпісваецца будаўніцтва ў Віцебску і двух праваслаўных храмаў (Свята-Духава і Дабравешчанскага). Насамрэч князем і княгіняй Марыяй Яраслаўнай была ўзведзена царква Святога Духа ў Заручаўі, якая стала адной з галоўных гарадскіх святыняў, а таксама адрамантавана Дабравешчанская царква XII стагоддзя.

Князь Альгерд, безумоўна, заслугоўвае помніка, бо паспрыяў развіццю горада і Віцебскай зямлі. За перыяд яго княжання Віцебск ператварыўся ў важны фарпост Вялікага Княства Літоўскага на ўсходніх рубяжах. Нават стаўшы вялікім князем, Альгерд даражыў Віцебскам. Пэўны час нікому не перадаваў горад і кіраваў ім як сваім уладаннем,— расказвае Анатоль Дулаў.

На вялікакняскім прастоле Альгерд праявіў сябе як таленавіты палітык і палкаводзец. Ён у міры і дружбе жыў з братам Кейстутам, які фактычна выступаў суправіцелем. Разам браты паспяхова супрацьстаялі націску крыжакоў. Альгерд працягваў палітыку свайго бацькі на ўсходзе, актыўна пашыраў межы дзяржавы за кошт усходнеславянскіх земляў. Перамога над ардынцамі на Сініх Водах у 1362 (1363) годзе паклала пачатак вызваленню земляў Русі ад ардынскага панавання.

Нават стаўшы вялікім князем, Альгерд даражыў Віцебскам. Пэўны час нікому не перадаваў горад і кіраваў ім як сваім уладаннем.

— У кантэксце палітыкі збірання ўсходнеславянскіх земляў і трэба разглядаць сутыкненне з Масквой, якая выступала адным з аб'яднаўчых цэнтраў ва Уладзіміра-Суздальскай Русі. Асноўным сапернікам Масквы была Цвер. У выніку шлюбу (пасля смерці першай жонкі Марыі) з цвярской князёўнай Ульянай Альгерд стаў саюзнікам цвярскіх князёў. Менавіта імкненне дапамагчы брату жонкі Міхаілу Аляксандравічу і адначасова перашкодзіць узвышэнню канкурэнта ў збіранні земляў і абумовілі выпраўленне Альгерда на Маскву,— працягвае гісторык.

Пры Альгердзе ўсе беларускія землі апынуліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Тэрыторыя дзяржавы дасягнула, па падліках гісторыка Вячаслава Насевіча, 630 тысяч кв. км. Пры гэтым тэрыторыя сучаснай Літвы займала толькі крыху больш за 10%, а беларускія землі — каля 1/3. Але па сваёй сутнасці гэтая дзяржава была дзяржавай нашых продкаў. Хоць пераважная дынастыя належала да літоўскага этнасу, які дамінаваў у палітычным жыцці Вялікага Княства, землі Русі далі дзяржаве ўзоры палітычных інстытутаў, падатковую і судовую сістэмы, традыцыі справаводства і афіцыйную мову. Вялікі ўплыў мела і праваслаўная царква. Недарэмна буйныя расійскія даследчыкі дарэвалюцыйнага часу лічылі гісторыю Літоўска-Рускай дзяржавы, як яны называлі Вялікае Княства Літоўскае, непасрэдным працягам гісторыі Кіеўскай Русі.

Зыходзячы з маштабнасці асобы князя Альгерда і яго ролі ў гісторыі ўсходняга славянства, ён быў увекавечаны на помніку «Тысячагоддзе Расіі», устаноўленым у 1862 годзе ў Ноўгарадзе, сярод такіх буйных дзяржаўных дзеячаў, як Яраслаў Мудры, Уладзімір Манамах, Іван III, Пётр I, Кацярына II і іншых.

— Таму фігура Альгерда ў маім разуменні — гэта фігура мудрага і моцнага палітыка, збіральніка земляў і абаронцы Айчыны, сімвала дзяржаўнай магутнасці, літоўска-беларускага пабрацімства і ўсходнеславянскай еднасці,— рэзюмуе Анатоль Дулаў.

Адкрыццё помніка князю Альгерду запланавана на 15 гадзін 27 чэрвеня. Безумоўна, ён стане адной са славутасцяў горада, каля якой гараджане будуць расказваць гасцям аб тым, што Альгерд зрабіў калісьці іх горад адным з самых моцных у Еўропе ў ваенным і гандлёвым пытаннях.

Даведка «Звязды».

Аўтар помніка Альгерду — мінскі скульптар Сяргей Бандарэнка. У сваёй творчасці ён звяртаецца да шматлікіх жанраў, выкарыстоўваючы розныя матэрыялы і тэхналогіі. Але сапраўднай любоўю Сяргея Бандарэнкі з'яўляюцца коні. Яго скульптуры коней вызначаюцца выключным падабенствам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Парламенцкі дзённік

РЭГУЛЯВАННЕ ЦЭН ПА-НОВАМУ

Чарговае пасяджэнне сесіі прайшло ў ніжняй палаце беларускага парламента. Дэпутаты разгледзелі восем пытанняў, якія закраналі цэнаўтварэнне, бяспеку дарожнага руху, ратыфікацыю некаторых пагадненняў з Расійскай Федэрацыяй і Садружнасцю Незалежных Дзяржаў.

РЫНАК БЯРЭ СВАЁ

Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, расказаў журналістам пра сутнасць законапраекта «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб цэнаўтварэнні»:

— Дзеючы Закон «Аб цэнаўтварэнні» быў прыняты ў 1999 годзе, апошнія папраўкі ў яго ўносіліся ў 2009 годзе. Пяць гадоў папраўкі не ўносіліся. За гэты час быў уведзены шэраг нарматыўна-прававых актаў, заключаны міжнародныя пагадненні. Прыняцце гэтых законаў, а таксама практыка дзейнасці дзяржаўных гаспадарчых органаў патрабуе змянення заканадаўства аб цэнаўтварэнні. Асноўныя змены тычацца рэфармавання структуры дзяржаўнага кіравання ў сферы дзяржаўнага рэгулявання цэн. У заканадаўстве выразна размяжоўваюцца паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады ў сферы цэнавога рэгулявання.

Новаўвядзеннем законапраекта з'яўляецца выключэнне абавязковага рэгулявання цэн прадпрыемстваў-манапалістаў. Гэтая норма будзе дзейнічаць у адпаведнасці з антыманапольным заканадаўствам. Таксама праект закона прадастаўляе прадпрыемствам, якія не парушаюць антыманапольнае заканадаўства, свабоду фарміравання затрат. Адпаведна, мы ідзём па шляху лібералізацыі цэнаўтварэння, таму што гэта неабходна для больш дынамічнага развіцця эканомікі, павышэння канкурэнтаздольнасці. Мы працуем ужо ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, дзе цэны вызначаюцца свабодна. Вельмі важна, каб краіны-ўдзельніцы рухаліся разам у гэтым кірунку.

Выступоўца падкрэсліў, што праект закона прадугледжвае рэгуляванне цэн і тарыфаў толькі ў дачыненні да тавараў і паслуг, якія выраблены або рэалізуюцца ва ўмовах натуральных манаполій. Таксама будуць рэгулявацца цэны на асобныя тавары, работы і паслугі, канкрэтны пералік якіх усталёўвае Прэзідэнт або Савет Міністраў па даручэнні кіраўніка дзяржавы.

— У цэлым законапраект прадугледжвае стварэнне ўмоў для пераходу да рыначных механізмаў цэнаўтварэння. Безумоўна, гэта павысіць якасць і канкурэнтаздольнасць тавараў, работ і паслуг,— рэзюмаваў Уладзіслаў Шчэпаў.

ЯК ВЫРАШЫЦЦА ПРАБЛЕМА З ПАРКОЎКАМІ?

Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі, якая рыхтавала праект Закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях забеспячэння бяспекі дарожнага руху», упэўнены, што новаўвядзенні дакумента добра адлюстроўюцца на набалелых сітуацыях з паркоўкай.

— Прадугледжваецца норма, якая дазваляе буксіроўку і перастаноўку транспартных сродкаў без змяшчэння на штрафную стаянку. Акрамя таго, уводзіцца магчымасць фіксацыі правапарушэнняў, звязаных з няправільнай паркоўкай, спецыяльнымі сродкамі фотавідэафіксацыі. Гэта дазволіць навесці, асабліва ў цэнтры горада, парадак з паркоўкамі.

Як паведаміў дэпутат, камеры фотавідэафіксацыі працуюць у аўтаматычным рэжыме з адзінай базай і аўтаматычна вызначаюць уласніка транспартнага сродку. Але канчатковае рашэнне па адміністрацыйным працэсе выносіцца ўпаўнаважанай на гэта асобай.

НА СТРАХ КАРУПЦЫЯНЕРАМ

Аляксандр СЦЯЦКО, член Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, які выступаў судакладчыкам па праекце Закона «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб павышэнні эфектыўнасці супрацоўніцтва ў сферы барацьбы з карупцыяй», лічыць, што дакумент мае важнае практычнае значэнне.

— Пагадненне стварае прававую аснову для сумеснага дзеяння кампетэнтных органаў па папярэджанні карупцыі: для правядзення следча-вышуковых мерапрыемстваў, для абмену інфармацыяй, выяўлення і канфіскацыі маёмасці, якая назапашана незаконным шляхам. Дакумент прадугледжвае правядзенне сімпозіумаў, семінараў… У першую чаргу ён накіраваны на абарону правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі ў сферы барацьбы з карупцыяй.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

Подзвіг народа — у музейных экспазіцыях

1944-2014 70 гадоў вызвалення

Да святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў рыхтуюцца ўсе музеі краіны. Наведвальнікаў чакаюць цікавыя выставы, прымеркаваныя да знакавай даты ў гісторыі беларускага народа.

— У Беларусі 154 дзяржаўныя музеі,— зазначыў **намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Васіль ЧЭРНІК.**— У дні святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у кожным з іх адкрыюцца тэматычныя экспазіцыі, нягледзячы на тэматыку музеяў і іх скіраванасць.

На 2 ліпеня запланавана адкрыццё Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Як падкрэсліў намеснік міністра, усімі формамі сваёй дзейнасці гэты музей служыць адукацыйна-выхаваўчым мэтам, выконвае высокую гуманістычную місію.

Вераніка КАНЮТА.

СТРАТЫ АД… ЭКСПАРТУ

Добра, калі прадпрыемства мае тавараправодную сетку для экспартных паставак, але гэта яшчэ не гарантыя поспеху знешнегандлёвых аперацый. Вось якія факты прыводзіліся на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.

Лідскае прадпрыемства «Лакафарба» ажыццяўляла рэалізацыю прадукцыі на экспарт праз уласную тавараправодную сетку (гандлёвыя дамы «Ліда ЛК» у Маскве і «ЛК-Украіна») па цэнах, ніжэйшых за рыначныя ў краінах-атрымальніках тавару, і нават са стратамі. А пастаўкі больш за 70% прадукцыі торфабрыкетных заводаў «Лідскі» і «Дзітва» на адрас уласнай тавараправоднай сеткі UAB «Belfuel» LTD (Літва) не былі падмацаваны кантрактамі для яе далейшай рэалізацыі замежным партнёрам. У выніку — невыкананне пакупніком абавязацельстваў па аплаце і пратэрмінаваная запазычанасць. Акрамя таго, значная колькасць адгружаных паліўных брыкетаў захоўваецца ў порце г. Клайпеда пад адкрытым небам і з-за ўздзеяння атмасферных ападкаў стала непрыдатнай.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Минский районный исполнительный комитет 25 июля 2014 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Инженерная инфраструктура *	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Боровлянский с/с, д. Скураты, участок № 4	623680607601000044	0,1304 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	3 259 500	170 000 000	34 000 000
2	Гаранский с/с, аг. Чачково	623681319101000496	0,1313 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	4 822 942	71 000 000	14 200 000
3	Ждановичский с/с, д. Тарасово, ул. Загородная, 51	623681709601002065	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ	6 426 000	414 000 000	82 800 000
4	г. Заславль, пер. Вилейский	623650100001004805	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ, водопровод	6 770 928	304 000 000	60 800 000
5	Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 749, участок № 13	623683403101006631	0,1482 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	741 000	133 000 000	26 600 000
6	Лошанский с/с, д. Горошки	623684002601000056	0,1338 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, водопровод	5 261 286	70 000 000	14 000 000
7	Лошанский с/с, д. Лабенщина	623684004601000053	0,1018 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, водопровод	7 521 710	70 000 000	14 000 000
8	Луговослободской с/с, д. Ксаверово	623684107601000095	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, водопровод	6 158 232	60 000 000	12 000 000
9	Папернянский с/с, д. Селюты, участок № 5	623685509601000036	0,0914 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	5 785 234	250 000 000	50 000 000
10	Сеницкий с/с, аг. Атолино, участок № 252	623686600601000432	0,1355 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	450 000	184 000 000	36 800 000
11	Сеницкий с/с, п. Скориничи, участок № 25	623686606101000183	0,1523 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	450 000	224 000 000	44 800 000
12	Хатежинский с/с, д. Рыжики, участок № 4	623687506601000035	0,1187 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	5 321 310	130 000 000	26 000 000
13	Хатежинский с/с, д. Старое Село, участок № 13	623687507101000534	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	1 275 000	150 000 000	30 000 000
14	Шершунский с/с, д. Дашки	623685804601000017	0,1370 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	7 783 500	15 000 000	3 000 000
15	Юзуфовский с/с, д. Шепели	623688208601000145	0,1185 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	8 741 800	62 000 000	12 400 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **25.07.2014 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **21.07.2014 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе на лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 Боровлянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На лот 3 перечисляется на расчетный счет № 3641621030047 Ждановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На лот 4 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 Заславского горисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На лот 5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 Колодищанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На лоты 6–7 перечисляется на расчетный счет № 3641900000046 Лошанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На лот 8 перечисляется на расчетный счет № 3641900000075 Луговослободского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На лот 9 перечисляется на расчетный счет № 3641621120061 Папернянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На лоты 10–11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000134 Сеницкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

На лоты 12-13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На лот 14 перечисляется на расчетный счет № 3641900000059 Шершунского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052358, код платежа – 04901.

На лот 15 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 Юзуфовского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

3. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

4. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

4.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано только одним участником аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов); для участия в аукционе не было подано ни одного заявления; на аукцион явился один из участников или ни один из участников не явился на аукцион.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается нерезультативным в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона не предложил свою цену.

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Результаты аукциона аннулируются, если победитель аукциона в установленный срок: не внес плату за земельный участок; не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не выполнил условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, а также иные условия участия в аукционе. При этом внесенный победителем аукциона задаток возврату не подлежит.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

РУП «Белпочта» ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ по выбору генподрядной строительной организации для выполнения строительно-монтажных работ на объекте «Реконструкция части здания специализированного связи на территории Национального аэропорта Минск, д. 86».

Процедура переговоров состоится **01 июля 2014 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.** Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства, **тел.: 293-55-29, 293-55-28.**

УНП 101015728

Утерянный страховой сертификат, удостоверяющий заключение договора страхования «Зеленая карта» серии BY/12 №9997505 СООО «Белкоопстрах» **считать недействительным.**

УНП 100706519

ШКОЛА НА ЗАМКУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядома, што ўтрымліваць будынак і абслуговы персанал пры невялікай колькасці вучняў — вельмі накладная справа. Існуе афіцыйны дазвол Міндукацыі на гэты конт: калі школу наведвае не больш за 25 чалавек і, што яшчэ горш, яна неперспектыўная, яе лепей зачыніць, чым пускаць грошы на вецер. У гарадах такой праблемы няма, у некаторых школах ледзь хапае месцаў. А вось сельскія — паміраюць. І рашэнне, быць ім ці не, у першую чаргу прымаюць раённыя ўлады. Адказнасць вельмі вялікая. Вядома, што калі няма школы, вёска, лічы, асуджана. Нават калі там з'явіцца нейкае прадпрыемства, моладзь наўрад ці паедзе туды. Навошта, калі няма магчымасці прыстроіць кудысьці сваё дзіця?

ПАД ПРЭСАМ АПТЫМІЗАЦЫІ

Наколькі гэта балючы працэс, у Клічаўскім райвыканкаме ведаюць вельмі добра. Тым больш што ў раёне, акрамя Ганчанскай школы зачыняецца яшчэ адна — Усохская. Галіна Данілкіна, намеснік старшыні па сацыяльных пытаннях, запэўнівае, што з боку мясцовых улад зроблена ўсё для таго, каб абысціся малой крывёю. Для падвозу дзяцей у іншыя школы закуплены аўтобус, тыя настаўнікі, якія яшчэ не на пенсіі, і нават тэхперсанал працаўладкаваны. Тэхнічцы з Ганчанскай школы, напрыклад, знайшлі працу ў суседняй вёсцы, куды яна і плануе пераехаць на пастаяннае месца жыхарства. Чаргавы раз зменіць прапіску і настаўніцкая сям'я з гэтай жа школы. У 90-я гады зачынілася школа ў Ядранай Слабадзе, дзе яны працавалі, а цяпер прыйдзецца перабірацца ў больш перспектыўную Дзмітраўку.

Для школьных будынкаў таксама шукаюцца новыя гаспадары. Напрыклад, ёсць ахвотныя купіць Усохскую школу пад паляўнічы домік. З Ганчанскай пакуль пытанне не вырашана. Мясцовыя ўлады збіраюцца выставіць будынак на аўкцыён. Пакуль там знаходзяцца бібліятэка і клуб.

Зразумела, ніхто не вінаваты ў тым, што школы зачыняюцца. «Мы не прыхільнікі гэтага, — запэўнівае Галіна Данілкіна. — Жыццё само прымушае так рабіць. Дзяцей няма, а ўтрыманне амаль пустой установы — вельмі вялікая раскоша па цяперашнім часе. Тым больш калі не відаць ніякіх перспектыў. У тым жа Ганчанскім пасёлку засталіся ў асноўным пенсіянеры».

Тое, што дзяцей прыйдзецца вазіць у суседнія вёскі, для іх бацькоў не вельмі прыемная перспектыва. Але ж да ўсяго прывыкаеш.

— Мы праводзілі нават эксперымент, — расказвае Галіна Данілкіна. — З Бёрдаўскай школы, якая таксама з неперспектыўных, на працягу года вазілі вучняў старэйшых класаў у Клічаў. Дарослыя паназіралі за гэтым і цяпер нават самі звяртаюцца з прапановай перавесці ў горад іх малодшых дзяцей. У райцэнтры больш магчымасцяў развівацца, тут ёсць гурткі на любы густ, спартыўныя секцыі, працуе група падоўжанага дня. А галоўнае — захоўваецца льгота для вучняў сельскіх школ — бясплатнае харчаванне. Плюс яшчэ ў тым, што дзеці вучацца жыць у соцыуме. Ёсць жа розніца, калі ў класе 1–2 вучні і калі іх 25.

На жаль, працэс з закрыццём школ пакуль не спыніць. У тым жа Клічаўскім раёне яшчэ ёсць малакамплектныя школы, дзе колькасць вучняў складае 23–50 чалавек. І прагнозы несуцяшальныя. Закрыццё некаторых могуць падштурхнуць і іншыя прычыны. Па новых санітарных патрабаваннях у школах павінна быць халоднае і гарачае водазабеспячэнне, санвузлы — знаходзіцца не на вуліцы, а ў памяшканні. На жаль, гэта не ўсюды ёсць. Некаторыя сельскія школы прасцей знесці і пабудаваць новыя, чым прыводзіць іх у адпаведнасць з нормамі.

ЦЭНТР ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

А як быць са школамі, якія па колькасці сваіх вучняў адносяцца да неперспектыўных, але з'яўляюцца ледзь не нацыянальным здабыткам? Тая ж Усакінская школа, дзе ўсяго 12 дзяцей. На від яна хутчэй нагадвае менавіта музей, чым храм ведаў. Цэнтралізаванага аціплення няма, у аўдыторыях замест батарэй — пабеленыя грубкі. Але размова пра яе закрыццё пакуль не ідзе — вельмі шмат яна значыць для раёна. Школа знаходзіцца ў тым месцы, дзе падчас вайны размяшчаўся цэнтр партызанскага руху. Школьнікаў тут няшмат, але яны займаюцца актыўнай валанцёрскай дзейнасцю, сочаць за парадкам на вуліцах вёскі, прымаюць удзел у добраўпарадкаванні мемарыяльнага комплексу «Усакіна», разам з настаўнікамі даглядаюць пахаванне часоў вайны, якое знаходзіцца ў лесе.

— Мы пастаянна прымаем турыстаў з розных гарадоў, падтрымліваем сувязь з магілёўскімі ліцэямі па лініі патрыятычнага выхавання, працуем з пошукавікамі, — адзначае дырэктар школы Аляксандр Радзько. — Школа з'яўляецца часткай



Фізрук Алег Зайцаў запрашае зірнуць на карту-схему славутасцяў мікразоны Усакінскай школы.

гісторыі нашай краіны, і калі яе не захаваць, гэтая старонка будзе проста страчана.

Для настаўніка фізкультуры Алега Зайцава школа не проста месца працы — жыццё. Ён нават летам не пакідае яе, сустракае тых турыстаў, якія цікавяцца багатай ваеннай гісторыяй Клічаўскага краю. Ды і мясцовы стадыён, за якім ён наглядае, адзіная на вёску пляцоўка, дзе ўсё лета гучаць дзіцячыя галасы. «Школа — гэта жыццё Усакіна, — разважае ён. — Не стане яе — не будзе і вёскі. Толькі яна яшчэ і трымае тут жыхароў».

Сэрца баліць па гэтай школе не толькі ў яе супрацоўнікаў. Нават кіраўнік Клічаўскага лясгаса Уладзімір Касянкоў за тое, каб яна існавала. Гэта гарантыя, што Усакінскае лясніцтва не застанецца без работы. Тут, як у ланцужку, усё звязана. Адно звяно страціш, усе астатнія рассыплюцца.

— Гэтую школу ў любым выпадку трэба захаваць, — упэўнены Аляксандр Крываносс, старшыня Патоцкага сельсавета, на тэрыторыі якога знаходзіцца Усакіна. — Яе трэба развіваць у патрыятычна-выхаваўчым і аздараўленчым напрамках, задзейнічаць як турыстычную базу. Тым больш што настаўнікі школы добра ведаюць гісторыю краю і іх веды былі б вельмі запатрабаванымі».

Дарэчы, у школе нават ёсць музей, у якім беражліва захоўваецца гісторыя легендарнага атрада «Слаўны», у які ўваходзіла спартыўная эліта з Масквы. «Нашы вучні — таксама добрыя спартсмены, — ганарыцца Алег Зайцаў. — Годная змена байцам са «Слаўнага». Сам Алег Міхайлавіч нават узнагароджаны расійскім медалём за патрыятычнае выхаванне моладзі і за тое, што дзякуючы яму захоўваецца памяць аб «Слаўным». Да ўрочышча Верамееўка, дзе пахаваны байцы, каля 12 кіламетраў. І фізрук водзіць экскурсіі той экстрэмальнай сцежкай сярод дрыгвы, якой прабіраліся гэтыя адважныя салдаты.

ЗАСТАЦЦА Ў ЖЫВЫХ

Усакінская школа, лічы, выключэнне. Большасць сельскіх школ не мае гучных гісторый, але для тых людзей, якія ў іх вучыліся ці вучылі, яны самыя лепшыя. Сельскія настаўнікі, у адрозненне ад сваіх гарадскіх калег, сваіх вучняў ведаюць з пялюшак. Для іх закрыццё школы раўназначнае страце не чагосьці, а нават кагосьці па-сапраўднаму блізкага. Бачылі б вы, як радуюцца ў чэрыкаўскім аграгарадку Майскі кожнаму немаўлятку.

— Летась іх было 3, а наогул у аграгарадку 5 сем'яў, дзе растуць дзеткі ад 3 да 7 гадоў, — шчаслівa ўсміхаецца дырэктар Майскага вучэбна-педагагічнага комплексу «Яслі-сад — сярэдняя школа» Любоў Свечнікавa. — Гэта значыць, што на бліжэйшыя гады школа без працы не застанецца.

Пакуль да крытычнай планкі — 25 вучняў — тут далёка. У мінулым навучальным годзе было амаль удвая больш вучняў. І ў наступным колькасць не паменшыцца.

Ёсць такі стэрэатып, што сельскія школьнікі менш адукаваныя, чым іх гарадскія аднагодкі. Але шмат фактаў гэта абвяргаюць. Справа не ў

Усакінская школа.

Вучні Усакінскай школы Сяргей Ісаеў і Улад Бабіцкі: «А нам наша школа падабаецца!».

школах, а ў настаўніках і іх выхаванцах. А таленты ёсць усюды.

За школу трэба змагацца, упэўнена Любоў Сцяпанаўна. У раёне яе ведаюць як дзейнага чалавека і таленавітага арганізатара. Невыпадкова ж яна тройчы перавыбіралася ў мясцовыя органы кіравання. Па ініцыятыве Любові Свечнікавай у аграгарадку з'явіўся ўтульны дзіцячы сад, не без яе ўдзелу будавалася і сама школа. Настаўніца памятае, як да гэтага вучэбныя класы размяшчаліся ў… кватэрах жылога дома. І што значыць працаваць у прыстасаваных для заняткаў кабінетах, Любоў Свечнікава добра ведае. Таму і лічыць, што заўсёды прасцей зламаць, чым пабудаваць.

Дарэчы, цяпер нараджальнасць на Магілёўшчыне зноў пачала набіраць абароты. Як бы праз некалькі гадоў не задацца новай праблемай — куды адправіць на вучобу дзяцей?

Каментарый у тэму

Наталля ПУШНОВА, начальнік аддзела агульнай сярэдняй і прафесійнай адукацыі ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама.

— Па пытаннях аптымізацыі малакамплектных школ, вядома, ёсць скаргі. Шмат каго пужаюць перамены, тое, што дзіця будзе вучыцца ў суседняй вёсцы ці горадзе. Але, як паказвае вынік, калі ўсё растлумачыць і паказаць на справе, як гэта будзе, людзі разумеюць: перамены толькі на карысць дзіцяці. Згадзіцеся, што 1 чалавек у класе — гэта ненармальна. Для гарманічнага развіцця асобы трэба знаходзіцца ў соцыуме. Тое, што школа — гэта цэнтр, без якога вёска пачынае распадацца, таксама вядома. Кіраўнікі раёнаў павінны ўзважана падыходзіць да гэтага пытання і не сячы з пляча. Рашэнне прымаюць старшыні райвыканкамаў, а мы толькі рэгулюем гэты працэс. Вывучаем, наколькі абгрунтаванае гэтае рашэнне, як вырашаюцца пытанні па працаўладкаванні настаўнікаў і тэхперсаналу, падвозу дзяцей да бліжэйшых школ. Міністэрствам адукацыі ў плане па аптымізацыі агаворваецца спыненне дзейнасці ці рэарганізацыя ў школах з колькасцю да 25 вучняў. У нас часам гэта лічба яшчэ меншая.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

■ Адкрытая пляцоўка

ГАСЦІННАСЦЬ ЯК «ФІШКА»

Акрэсленага брэнда няма пакуль ні ў нашай сталіцы, ні ў краіне ўвогуле

Задаваць пытанні, для чаго патрэбен брэндынг, ужо лічыцца непрыстойным. Без якаснага цэласнага вобразу немагчыма выгадна прадаць прадукт. Тое ж самае і з тэрыторыямі: каб залучыць інвестыцыі ў пэўны рэгіён, трэба стварыць яго брэнд. Вось ужо трэці год запар у Мінску на Міжнародным фестывалі тэрытарыяльнага маркетынгу і брэндынгу OPEN збіраліся сусветныя прафесіяналы ў сферы маркетынгу тэрыторый, каб абмяняцца вопытам, а таксама выбраць лепшыя праекты, дасланыя на конкурс удзельнікамі з розных краін. Трохдзённы форум не толькі запаліў новыя «зоркі» на брэндынгавым небасхіле, але і выкрыў шмат пытанняў…

НА ЧЫМ АКЦЭНТ ПАСТАВІМ?

Адкрыла серыю прэзентацый старшыня праўлення ГА «Адпачынак у вёсцы» Валерыя Кліцунова. У сваім выступленні яна разглядала праблему дэстынацый (месцаў прызначэння турысцкай андроўкі). Паводле слоў спецыяліста, у нашай краіне створана амаль два дзясяткі дэстынацый — цікавых ідэй турпрадуктаў, якія трэба ператварыць у брэнд. Сярод іх — Лепельшчына (дзе апошнім часам актыўна распрацоўваецца легенда пра беларускага Цмока), Моталь з яго славутым фэстам «Мотальскія прысмакі», Палессе, здольнае прывабіць сваімі чароўнымі балотамі, Налібоцкая пушча… Але ўсе гэтыя аб'екты яшчэ не аформліся ў «таварныя знакі». Па словах Валерыі Кліцуновай, акрэсленага брэнда пакуль няма ні ў Мінска, ні нават у Беларусі. «Звязда» пацікавілася, што павінна ўваходзіць у брэнд нашай краіны.

Фота БЕЛТА.

— Пры стварэнні брэнда на нечым трэба рабіць акцэнт. На культурнай спадчыне нельга, таму што многія бачылі замкі і цэрквы ў Італіі, Францыі, Іспаніі, і мы не можам з гэтым канкурыраваць. Нам трэба выбіраць тое, што ёсць у нас і ўжо, умоўна кажучы, знікла ў Еўропе (бо найбліжэйшыя нашы суседзі — еўрапейцы). Гэта, безумоўна, наша беларуская вёска, наша гасціннасць, традыцыі, прырода, — пераканана Валерыя Кліцунова.

Эксперт лічыць, што галоўны складнік, неабходны Беларусі для таго, каб стаць «салодкім кавалачкам» для турыстаў, — гэта партнёрства.

— Усе павінны працаваць на адну ідэю, а гэта значыць, што нам не патрэбны візы, што мы павінны вучыць англійскую мову, высвятляць у месцічаў, якія цікавінкі яны могуць паказаць турыстам (гэта значыць людзям, якія прывезлі ім заробак). Я нядаўна была ў Масаі-Мара (запаведнік у Кеніі, названы ў гонар карэннага насельніцтва гэтага рэгіёна — племені масаі. — **Аўт.**), жыла ў племені. На маю думку, гэта самы мудры народ, які трымае абарот (турыстычны. — **Аўт.**), захоўваючы традыцыі. І калі я сказала, што таксама займаюся турызмам, і мы можам абмяняцца вопытам, навучыцца нечаму, мне сказалі: «Так, ты можаш шмат чаму навучыцца ў нашага народа». Хачу, каб і ў Беларусі калі-небудзь так сказалі: вы можаце многаму навучыцца ў нашага народа.

БРЭНД СТВАРЫЛІ. А ШТО З ІМ РАБІЦЬ?..

Эксперты разважалі пра тое, якім будзе тэрытарыяльны брэндынг праз 10 гадоў — у 2024 годзе. Ці будзе гэта асобная галіна, хто будзе кіраваць распрацаванымі брэндамі і якім чынам яны будуць выкарыстоўвацца… Апошняе пытанне застаецца, бадай, самым актуальным. Так, летась у конкурсе ўдзельнічала кампанія INSTID — тая самая, што распрацавала брэнд сталіцы «Think Minsk», які выклікаў нямала спрэчак у грамадскасці. Аднак яго рэалізацыі мінчане і госці горада так і не ўбачылі. Сітуацыю патлумачыла беларускі спецыяліст у сферы камунікацый і PR Наталля Грамадскіх:

— Мы створым брэнд Мінска, а што з ім рабіць? Ёсць страх і няведанне — гэта галоўныя прычыны, па якіх ён пакуль не прыняты. А на фестывалі мы як раз фарміруем веды і разуменне, для чаго і для каго патрэбен брэндынг.

— Важная частка ў стварэнні брэнда — прадукт гэта ці тэрыторыя — стратэгія. Ці рабіў хто-небудзь стратэгію брэнда Мінска? — пацікавіўся эксперт па брэндынгу з Расіі Дзмітрый Пёрышкаў. — Я часта сутыкаюся са стэрэатыпам: давайце зробім наш брэнд у выглядзе якогасьці пазнавальнага архітэктурнага сімвала. Але гэта нікому не трэба! Для чаго сюды едуць турысты, што яны хочуць тут пабачыць, што ў гэтым горадзе прывабнага? Павінна быць нейкая кропка, якая аб'яднае ўсіх мінчан і якую можна будзе прадаць знешняй аўдыторыі.

— Мы прыйшлі да таго, што нашы людзі і іх гасціннасць — гэта тое, што прывабіць сюды турыстаў, — распавяла крэатыўны дырэктар брэндынгавай кампаніі Fabula, якая распрацавала альтэрнатыўную версію брэнда Мінска «Nice to Minsk you» (ад англ. «nice to meet you» — «прыемна з вамі пазнаёміцца». — **Аўт.**), Вольга Кашкан. — Таму наш слоган з'яўляецца адлюстраваннем гэтай канцэпцыі. Але няма зваротнай рэакцыі з боку адміністрацыі, і мы не ведаем, што з гэтым рабіць, — развяла рукамі спецыяліст.

Удзельнікі форуму таксама абмеркавалі кадравую праблему ў сферы брэндынгу і маркетынгу тэрыторый. Паводле слоў Валерыі Кліцуновай, якая з'яўляецца дацэнтам кафедры міжнароднага турызму БДУ, немагчыма кіраваць турыстычнымі пунктамі пры адсутнасці спецыялістаў з адпаведнымі ведамі.

СЕЛЯДЦЫ І 10 СТАГОДДЗЯЎ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ

Тым не менш, па словах кіраўніка фестывалю Алены Новікавай, узровень конкурсных работ, асабліва тых, якія прадстаўляюць нашу краіну, расце. Сёлета на конкурс было заяўлена 33 праекты ў розных намінацыях. Сярод удзельнікаў, якія наважыліся абвясціць на ўвесь свет, што маюць досвед у брэндынгу, і камерцыйныя кампаніі, і дзяржаўныя культурныя і навучальныя ўстановы, і прыватныя асобы. Ніводная праца не засталася без увагі журы. І пасля публічных прэзентацый і суда спецыялістаў фестываль OPEN вызначыў сваіх пераможцаў. Сярод нешматлікіх работ, якія занялі першыя месцы, аказаліся «Распрацоўка брэнда горада Мурманска», «10 стагоддзяў мастацтва Беларусі» ад Нацыянальнага мастацкага музея, анімацыйны праект «Беларусь — гэта цікава!» ад творчага калектыву «Майстэрня ўражанняў», «Фірмовы стыль горада Краснакамск» і ў намінацыі «Нацыянальна арыентаваны брэнд» — брэнд селядцоў «Князь Рыбанька» ад кампаніі Fabula.

Варта адзначыць, што на конкурсе надзвычай актыўнай аказалася каманда Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта: студэнты падалі чатыры работы ў дзвюх намінацыях і, хоць не занялі прызавых месцаў, дыпломы фіналістаў атрымалі. «Хачу выказаць сваё захапленне цудоўнай камандай БДТУ. Мы вельмі шмат спрачаліся наконт вашых работ. Думкі падзяліліся, але ўсе сышліся ў тым, што ваша камандная праца сведчыць пра вашу вялікую будучыню», — сказаў старшыня журы Рыгор Памяранцаў.

Галоўнай жа інтрыгай фэсту стала тое, што… гран-пры не атрымаў ніхто. Па словах Рыгора Памяранцава, ніводная з работ не можа быць арыенцірам, на які можна раўняцца. Што ж, наша краіна робіць свае першыя крокі ў сферы маркетынгу тэрыторый, і хто ведае, магчыма, налета такім арыенцірам для ўсіх стане брэнд Беларусі?

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Да ведама

«ЗБРОЕВАЯ АМНІСТЫЯ» ЗАКАНЧВАЕЦЦА 1 ЛІПЕНЯ

У органы ўнутраных спраў для рэгістрацыі ўжо здадзена звыш 380 адзінак няўлічанай грамадзянскай зброі. Як правіла, у міліцыю прыносяць гладкаствольныя паляўнічыя стрэльбы, газавыя рэвальверы і пісталеты.

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, спачатку «ствалы» накіроўваюцца на абавязковую сертыфікацыю ў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, пасля чаго рэгіструюцца. Той, хто адгукнуўся на прапанаваную дзяржавай «зброевую амністыю», ужо стаў уладальнікам дазволу на захаванне і нашэнне зброі, якая захоўвалася незаконна. Без наступнай рэгістрацыі былі здадзены 152 адзінкі няўлічанай зброі.

МУС рэкамендуе грамадзянам, якія незаконна захоўваюць зброю, скарыстацца магчымасцю не толькі пазбегнуць крымінальнай і адміністратыўнай адказнасці за незаконныя дзеянні, але і зарэгістраваць яе на сябе, стаць законным уладальнікам. Для гэтага грамадзяне Беларусі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі краіны, павінны да 1 ліпеня прад'явіць няўлічаную зброю для рэгістрацыі. Падрабязную інфармацыю можна атрымаць у падраздзяленнях па дазвольнай рабоце тэрытарыяльных органаў унутраных спраў або па нумары 102.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Далучайцеся!

ЗРАБІЦЕ «ЗВАНОК МІЛАСЭРНАСЦІ»

Акцыя пад такой назвай распачалася на Гродзеншчыне

Патэлефанаваўшы па нумары **8-902-214-1111,** вы пералічыце 12 тысяч беларускіх рублёў гродзенскаму аддзяленню рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі дзіцячы фонд» на дапамогу дзецям, якія маюць патрэбу ў лячэнні за мяжой.

ОАО «Дубровенский райагросервис»:

УРОЖАЙ – ДЕЛО ТЕХНИКИ

НАШИ ВОЗМОЖНОСТИ:

✓ имеем собственную пилораму;
✓ располагаем базой для приема, хранения и отпуска минеральных удобрений и доломитовой муки;
✓ реализуем запасные части автотранспортной и кормозерноуборочной техники;
✓ осуществляем замену и ремонт шин;
✓ ремонтируем двигатели внутреннего сгорания, топливную аппаратуру дизельных двигателей, вакуумные насосы, автотранспортное оборудование;
✓ производим токарные и сварочные работы;
✓ изготавливаем столярные изделия, беседки, сетку рабицу, гвозди;
✓ заправляем кондиционеры;
✓ диагностируем и ремонтируем электрооборудование, топливные системы и гидрооборудование энергонасыщенной сельхозтехники.

ОАО «Дубровенский райагросервис»

ПРИГЛАШАЕМ К СОТРУДНИЧЕСТВУ!

211040,
Витебская область,
г. Дубровно,
пер. Красноармейский, 6
Тел.: 8-02137-4-13-36
Факс: 8-02137-4-24-11
E-mail:
dubagroservis@mail.ru
УНП 300067444

ОАО «Дубровенский райагросервис» занимается известкованием кислых почв, вывозкой и внесением минеральных и органических удобрений, химзащитными работами и подготовкой почвы. Обслуживает животноводческие фермы и артезианские скважины. Оказывает услуги по перевозке ГСМ и располагает 8 бензовозами; по центровывозу молока, имея в распоряжении 12 молоковозов; по перевозке грузов самосвалами и тягачами МАЗ; при погрузочно-разгрузочных работах – автокранами.

Общество расположено в районном центре Дубровно, расстояние от Витебска 115 км, до ближайшей ж.д. станции Осиновка – 10 км.

ОАО «Дубровенский райагросервис» –
многоструктурное общество,
в его состав входят следующие отделы:

- **материально-технического снабжения;**
- **перевозки грузов;**
- **механизированных работ;**
- **монтажно-ремонтных работ;**
- **деревообработки.**

■ Вакол футбола

Людас РУМБУЦІС:

«У ФУТБОЛЕ СЁННЯ НЯМА АЎТАРЫТЭТАЎ, І ГЭТА ВЕЛЬМІ ДОБРА»

Чэмпіён СССР 1982 года, майстар спорту, вядомы футбольны спецыяліст Людас Румбуціс распавёў пра ўзровень сучаснага футбола і падзяліўся думкамі аб выніках матчаў чэмпіянату свету.

— Людас Ёнавіч, што можаце сказаць аб якасці футбола на чэмпіянаце свету-2014?

— Прыемнай нечаканасцю для мяне стала тое, што свет нарэшце вярнуўся да «бегавога» футбола, дзе ўсё вырашае сукупнасць якасцяў: тэхніка, тактыка і фізічная падрыхтоўка. Паглядзіце, як і колькі перамяшчаюцца па полі галандцы, мексіканцы, чылійцы. У іх і перамогі.

Другі момант — на чэмпіянаце мы назіраем вельмі валявыя каманды. Што я маю на ўвазе? Раней у фінальнай частцы чэмпіянатаў назіралася такая тэндэнцыя — калі каманда-фаварыт забівала першы гол, то вынік матча быў практычна вырашаны. Сёння ўсё па-іншаму, відавочным фаварытам у пары Уругвай — Коста-Рыка быў Уругвай, Коста-Рыка прайгравала 0:1, але выйграла 3:1, гэта значыць, у футболе сёння няма аўтарытэтаў, і гэта вельмі добра.

Трэці момант, які таксама радуе — гэта выніковасць, вялікая колькасць галоў. Калі на папярэдніх першынствах многія каманды гулялі па тактыцы «цікі-така», кантроль над полем, кантроль мяча, рабілі ўпор на тое, каб «паставіць аўтобус», то цяпер такога ўжо няма.

— Якая са зборных вас расчаравала або здзівіла?

— На гэтым чэмпіянаце мяне адкрыта расчаравала толькі адна каманда — Гандураса. Яны гуляюць вельмі груба і, як прынята цяпер гаварыць, са сваім «аўтобусам» каля штрафной. Каманда не паказала ніякай тактычнай вывучкі, трэнерскай рукі я не ўбачыў. Усе астатнія зборныя гуляюць у нядрэнны футбол, Алжыр, Японія, Карэя, паглядзіце, як Расію «папаласкалі». Пройгрыш расіян — гэта зусім не дзіцячая памылка Акінфеева. Калі праціўнік доўга трымае мяч, варатар увесь час у напружанні, і гэтае напружанне дае пра сябе адчуваць.

— Вы сказалі, расчараваў толькі Гандурас. А Іспанія?

— Шчыра скажу, гэта не стала для мяне адкрыццём. Іспанцы былі нядрэнна падрыхтаваныя, але ў іх ёсць адна вялікая праблема — гульнявая дысцыпліна на полі. Успомніце матч з Чылі: гульня ідзе ў іх варатарскай, а абаронцы — проста гледачы. Гульнявая дысцыпліна адсутнічае, яны думалі, прыедуць з пяццю гульцамі «Рэала» і пяццю футбалістамі «Атлетыка», са спартсменамі, якія гулялі ў фінале Лігі чэмпіёнаў, і ўсе перад імі ўпадуць на калені. Нічога падобнага!

Вядома, зборная Іспаніі расчаравала вынікам, але асабіста я гэтага чакаў. Яшчэ да чэмпіянату было вядома, як яны будуць гуляць. Іспанскі трэнер Вісэнтэ Дэль Боске, на маю думку, памыліўся ў тым, што паспрабаваў спалучыць неспалучальнае: гульню «Барселоны» праз дробны пас і футбаліста, які гуляе толькі на контратаках, — Косту. Калі б гуляў, як на мінулых чэмпіянатах Еўропы і свету, Давід Вілья — магчыма, гэта быў бы іншы футбол, ён ведае гэтую гульню, разумее яе, умее падрываць абарону. А так атрымалася, што ў гэтай камандзе проста неадпаведнасць ліній атакі і абароны. У матчы з галандцамі пры ліку 1:0 «прапіжонілі» добры момант, забі яны тады — і ўвесь свет «хаваў» бы галандцаў. Але футбол тым і добры, што ён непрадказальны.

— Якія зборныя запомніліся яшчэ з першага раўнда чэмпіянату?

— Афрыканцы сёлета — нешта не зразумелае. Не бачу камандаў, ёсць асобныя гульцы, якія добра гуляюць па ўсім свеце: у чэмпіянатах Англіі, Германіі, Італіі, але каманд няма.

Што будзе далей са зборнай Галандыі — цікавае пытанне. Каманда Луі ван Гала гуляе толькі так, як патрабуе трэнер, па прынцыпе: не гуляеш па маіх патрабаваннях — увогуле не гуляеш. Яны на такім драйве і куражы згулялі з Іспаніяй, а перамагчы Аўстралію, я лічу, ім дапамог Усявышні. Па маім бачанні футбола, у тым матчы яны не найгралі нават на нічыю, але ім спадарожнічае фартуна. Са зборнай Аўстраліі яны паспрабавалі згуляць на майстэрстве, і аказалася, гэта не так проста: у мяне было такое адчуванне, што футбалісты выйшлі на поле, а мазгі забыліся ў раздзявальні. Так было паўтара тайма. Добра, што забілі, але гэта вынік індывідуальнага майстэрства Робіна, а не каманднай гульні.

Пра зборную Расіі пакуль магу гаварыць толькі, як пра нябожчыка, — альбо добра, альбо нічога.

Пакуль няма ніякага ўражання ад іх гульні. Але гэта не гаворыць аб тым, што гэта каманда дрэнная, у сусветным футболе часта бывае, што каманда пачынае дрэнна, а потым набірае ход. Успомніце мінулы чэмпіянат свету: Аргенціна забівала па 6 галоў за матч, Марадона на трэніроўках ужо хадзіў з цыгарай, заставалася толькі прывезці і аддаць яму ў рукі гэты Кубак свету. А што атрымалі на выхадзе, калі сустрэліся з немцамі, якія з цяжкасцю выйшлі з групы, усе памятаюць.

— Якая каманда можа зрабіць сюрпрыз?

— Сваім калектыўным духам спадабалася зборная Францыі. Узгадайце, калі ў кваліфікацыі французы прайгралі ўкраінцам 2:0, іх наступную гульню трэба было бачыць. Калі б на стадыёне тады выключылі святло, ад вачэй гульцоў поле б сыйшлася. Вось гэта зарад, там калектыў! Яны таксама могуць зрабіць сюрпрыз, прытым вялікі.

— Ці варта чакаць адкрыцця новых імёнаў у футболе на гэтым турніры?

— Кожны чэмпіянат свету адкрывае новыя імёны, зараз назваць кагосьці канкрэтна складана. «Зорак» вызначае стабільнасць, як правіла, яны не застаюцца незаўважанымі ў адборачных і групавых гульнях, але ім неабходна праходзіць кудысьці з камандай.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА

АБ АДПАВЕДНАСЦІ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПУНКТА 7 ЧАСТКІ 1 АРТЫКУЛА 29 І ПУНКТА 1 ЧАСТКІ 1 АРТЫКУЛА 303 КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНАГА КОДЭКСА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Сяргеевай В.Г., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Карповіч Н.А., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

з удзелам прадстаўнікоў бакоў:

Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — Чэравача В.А., намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве;

Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — Цімошчанкі В.В., намесніка начальніка ўпраўлення — загадчыка аддзела прававога аналізу і юрыдычнай экспертызы законапраектаў экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

разгледзеў у адкрытым судовым пасяджэнні справу «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пункта 7 часткі 1 артыкула 29 і пункта 1 часткі 1 артыкула 303 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь».

У судовым пасяджэнні прынялі ўдзел:

паўнамоцны прадстаўнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Канстытуцыйным Судзе — Міцкевіч В.В., намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

паўнамоцны прадстаўнік Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Канстытуцыйным Судзе — Міхалькова Л.С., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве;

паўнамоцны прадстаўнік Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Канстытуцыйным Судзе — Мароз Л.Ф., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве;

прадстаўнікі дзяржаўных органаў:

Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь — Калінковіч В.Л., намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь — Лашын А.М., намеснік Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь;

Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь — Гайдучонак В.А., намеснік Старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь — Тушынскі І.Г., намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Вядзенне па справе ўзбуджана Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь 12 мая 2014 г. на падставе частак першай і чацвёртай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Канстытуцыя), часткі першай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў і артыкула 32 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве» па прапанове ўпаўнаважанага органа — Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Падставай для ўнясення прапановы ў Канстытуцыйны Суд з'явіўся зварот у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу грамадзянкі Бялясавай Т.І., якая выказала нязгоду са спыненнем папярэдняга расследавання па крымінальнай справе ў адносінах да яе памерлага сына Бялясава І.В. з канстатацыяй вінаватасці апошняга ў здзяйсненні дарожна-транспартнага здарэння, у якім загінулі пасажыр і ён сам, паколькі як самім фактам спынення крымінальнай справы па нерэабілітуючай падставе, так і яго магчымыі юрыдычныі вынікамі істотна закрануты гонар і добрае імя памерлай асобы, а таксама законныя інтарэсы яе блізкіх сваякоў. У сувязі з гэтым пастанова аб спыненні папярэдняга расследавання па крымінальнай справе была абскарджана Бялясавай Т.І. у пракуратуру, орган папярэдняга следства і суды. Дадзенымі органамі спыненне вядзення па крымінальнай справе прызнана законным. Бялясава Т.І. лічыць, што спыненнем крымінальнай справы па нерэабілітуючай падставе без згоды блізкіх сваякоў памерлай асобы парушаюцца палажэнні артыкулаў 26 і 60 Канстытуцыі, што замацоўваюць прэзумпцыю невінаватасці і права кожнага на судовую абарону.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу мяркуе, што сумненні Бялясавай Т.І. у канстытуцыйнасці пункта 7 часткі 1 артыкула 29 і пункта 1 часткі 1 артыкула 303 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца абгрунтаванымі, бо пры спыненні крымінальнай справы ў адносінах да памерлай асобы спыняецца і далейшае даказванне яе вінаватасці, але падазрэнне або абвінавачанне ва ўчыненні злачынства з яе не здымаецца. Пры гэтым асоба, у адносінах да якой крымінальная справа спыняецца па ўказанай падставе, з прычыны смерці аб'ектыўна пазбаўлена магчымасці абараніць свае годнасць і гонар. Што датычыцца блізкіх сваякоў памерлай асобы, то ў крымінальна-працэсуальным законе не прадугледжана палажэнняў аб неабходнасці атрымання іх згоды на спыненне крымінальнага праследавання. На падставе выкладзенага Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ўнесена прапанова аб дачы Канстытуцыйным Судом заключэння аб адпаведнасці ўказаных норм Крымінальна-працэсуальнага кодэкса артыкулам 26 і 60 Канстытуцыі.

Згодна з пунктам 7 часткі 1 артыкула 29 і пунктам 1 часткі 1 артыкула 303 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 1999 года (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 28-29, арт. 433), уведзенага ў дзеянне з 1 студзеня 2001 года, са зменамі і дапаўненнямі (далей — КПК), у адносінах да памерлай асобы крымінальная справа не можа быць узбуджана, а вядзенне па ўзбуджанай справе падлягае спыненню, у тым ліку вядзенне падлягае спыненню ў судовым пасяджэнні, за выключэннем выпадкаў, калі вядзенне па крымінальнай справе неабходна для рэабілітацыі такой асобы.

Заслухаўшы суддзю-дакладчыка Варановіча Т.В., тлумачэнні прадстаўнікоў бакоў па справе — Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, меркаванні паўнамоцных прадстаўнікоў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу ў Канстытуцыйным Судзе, выступленні прадстаўнікоў Вярхоўнага Суда, Генеральнай пракуратуры, Следчага камітэта, Міністэрства юстыцыі, прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі, КПК і іншых заканадаўчых актаў, вывучыўшы матэрыялы справы, Канстытуцыйны Суд устанавіў.

1. У адпаведнасці з абзацамі першым, другім часткі чацвёртай артыкула 116 Канстытуцыі, абзацамі першым, другім часткі першай артыкула 22 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, часткай першай артыкула 114, часткай першай артыкула 118 Закона «О конституционном судопроизводстве» Канстытуцыйны Суд па прапановах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь дае заключэнні аб адпаведнасці законаў, дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, міжнародных дагавораў і іншых абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі і міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь.

Згодна з часткамі першай і другой артыкула 54, артыкулам 117 Закона «О конституционном судопроизводстве» Канстытуцыйны Суд можа даць заключэнне і ў дачыненні да актаў, якія заснаваны на праваным акце або аднаўляюць яго асобныя палажэнні, калі яны не ўпаміналіся ў прапанове аб праверцы канстытуцыйнасці гэтага акта.

У судовым пасяджэнні прадстаўнікі ініцыятара — Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на падставе часткі трэцяй артыкула 19 Закона «О конституционном судопроизводстве» пашырылі змест унесенай у Канстытуцыйны Суд прапановы, паясніўшы, што на норме пункта 7 часткі 1 артыкула 29 КПК грунтуюцца не толькі норма пункта 1 часткі 1 артыкула 303 КПК, але і нормы часткі 1 артыкула 250 і часткі 1 артыкула 279 КПК, згодна з якімі, калі будзе ўстаноўлена ўказаная ў пункце 7 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса акалічнасць, папярэдняе расследаванне па крымінальнай справе спыняецца, суддзёй пры назначэнні судовага пасяджэння выносіцца пастанова аб спыненні вядзення па крымінальнай справе. Прадстаўнікі ініцыятара лічаць, што праверцы на прадмет адпаведнасці Канстытуцыі падлягаюць узаемазвязаныя палажэнні пункта 7 часткі 1 артыкула 29, часткі 1 артыкула 250, часткі 1 артыкула 279, пункта 1 часткі 1 артыкула 303 КПК у дачыненні да сітуацыі, калі са спыненнем крымінальнай справы не згодны блізкія сваякі памерлай асобы.

Прадстаўнік боку — Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу падтрымаў дадзеную прапанову ініцыятара.

2. У адпаведнасці з артыкулам 39 Закона «О конституционном судопроизводстве» ў Вярхоўны Суд, Генеральную пракуратуру, Следчы камітэт і Міністэрства юстыцыі Канстытуцыйным Судом былі накіраваны запыты, і пісьмовых адказах на якія дзяржаўныя органы выклалі сваё меркаванне па справе.

Вярхоўны Суд лічыць, што ў мэтах прадастаўлення грамадзянам дадатковых гарантый рэалізацыі правоў згодна з палажэннямі артыкулаў 26 і 60 Канстытуцыі магчыма ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у КПК, якія дазваляюць блізкім сваякам патрабаваць прадаўжэння крымінальнага працэсу ў адносінах да памерлай асобы для яе рэабілітацыі, уключаючы разгляд справы ў судзе па сутнасці абвінавачання.

Па меркаванні Генеральнай пракуратуры, дзяржава, адмаўляючыся ад далейшага вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да памерлай асобы, не ставіць пад сумненне яе невінаватасць, кіруючыся канстытуцыйным прынцыпам наяўнасці для прызнання асобы вінаватай прыгавору суда, які ўступіў у законную сілу. Крымінальнае праследаванне ў адносінах да такой асобы спыняецца без прызнання яе вінаватай з прычыны адсутнасці суб'екта злачынства.

Следчы камітэт мяркуе мэтазгодным унясенне ў крымінальна-працэсуальны закон змяненняў, накіраваных на забеспячэнне судовай абароны памерлага падазронага (абвінавачванага) пры дапамозе разгляду такіх крымінальных спраў судамі, калі на гэтым настойваюць яго блізкія сваякі. Магчыма канкрэтызацыя пераліку іншых асоб, якім, апрача блізкіх сваякоў, можа быць нададзена ўказанае права, працэсуальных форм іх допуску да ўдзелу ў справе і адпаведнага прававога статусу.

Міністэрства юстыцыі ўказвае, што рэабілітацыя памерлай асобы выключае зварот спагнання на яе маёмасць па грамадзянскіхісках зацікаўленых асоб, што сведчыць аб непасрэдным інтарэсе ва ўзбуджэнні крымінальнай справы, вядзенні па ёй папярэдняга расследавання і судовым разборы блізкіх сваякоў такой асобы. У сувязі з гэтым у крымінальна-працэсуальным законе магчыма ўстанавіць норму аб неабходнасці абавязковага атрымання органам крымінальнага праследавання або судом згоды блізкіх сваякоў памерлай асобы на спыненне вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да такой асобы па нерэабілітуючых падставах.

3. Згодна з Канстытуцыяй чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы, а забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь — найвышэйшай мэтай дзяржавы; дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы (частка першая артыкула 2, часткі першая і трэцяя артыкула 21).

У адпаведнасці з Канстытуцыяй дзяржава забяспечвае свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы (частка першая артыкула 25); ніхто не можа быць прызнаны вінаватым у злачынстве, калі яго віна не будзе ў прадугледжаным законам парадку даказана і ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу (артыкул 26); кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на яго гонар і годнасць (артыкул 28).

Часткай першай артыкула 60 Канстытуцыі кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны.

У міжнародна-прававых актах замацаваны палажэнні аб тым, што ўсе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах; кожны чалавек, для вызначэння яго правоў і абавязкаў і для ўстанаўлення абгрунтаванасці прад'яўленага яму крымінальнага абвінавачання, мае права, на аснове поўнай роўнасці, на тое, каб яго справа была разгледжана публічна і з выкананнем усіх патрабаванняў справядлівасці незалежным і непрадузятым судом (артыкулы 1 і 10 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека); кожны мае права пры разглядзе любога крымінальнага абвінавачання, якое яму прад'яўляецца, на справядлівы і публічны разбор справы кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом (пункт 1 артыкула 14 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах).

Разам з тым згодна з нормамі пункта 7 часткі 1 артыкула 29, часткі 1 артыкула 250, часткі 1 артыкула 279, пункта 1 часткі 1 артыкула 303 КПК смерць падазронага або абвінавачванага з'яўляецца акалічнасцю, якая выключае вядзенне па крымінальнай справе па нерэабілітуючай падставе.

Такім чынам, пры спыненні крымінальнага праследавання ў адносінах да памерлай асобы спыняецца і далейшае даказванне яе вінаватасці, але пры гэтым падазрэнне або абвінавачанне ва ўчыненні злачынства з яе не здымаецца. Больш таго, як гэта ўказана ў пастанове аб спыненні вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да Бялясава І.В., канстатуецца ўчыненне памерлай асобай злачынства, ад далейшага крымінальнага праследавання якой упаўнаважаны дзяржаўны орган адмаўляецца толькі па прычыне смерці дадзенай асобы. У КПК не змяшчаецца палажэнняў аб неабходнасці атрымання згоды блізкіх сваякоў памерлай асобы на спыненне крымінальнага праследавання.

Незаконнае або неабгрунтаванае крымінальнае праследаванне — гэта перш за ўсё замах на такія замацаваныя ў Канстытуцыі асабістыя немаёмасныя правы грамадзяніна, як годнасць і гонар, што належаць чалавеку ад нараджэння і з'яўляюцца неадчужальнымі. Для рэалізацыі канстытуцыйных палажэнняў аб забеспячэнні дзяржавай годнасці асобы і гарантаванні кожнаму права на абарону ад замаху на яго гонар і годнасць (артыкулы 25 і 28 Канстытуцыі) у КПК прадугледжана магчымасць рэабілітацыі асобы, якой незаконнымі дзеяннямі органа, што вядзе крымінальны працэс, была прычынена шкода.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што з улікам устанаўлення ў Рэспубліцы Беларусь прынцыпу вяршэнства права, прызнання Рэспублікай Беларусь прыярытэту агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права (частка першая артыкула 7, частка першая артыкула 8 Канстытуцыі) вышэйзгаданыя канстытуцыйныя палажэнні і нормы міжнароднаправавых актаў не могуць прымяняцца выбіральна, а дзейнічаюць на ўсіх стадыях крымінальнага працэсу. У сувязі з гэтым Канстытуцыйны Суд лічыць, што нормы крымінальна-працэсуальнага закона ў той частцы, у якой яны дапускаюць указанне на вінаватасць ва ўчыненні злачынства грамадзяніна без вынясення абвінаваўчага прыгавору суда, не замацоўваючы пры гэтым палажэнняў аб праверцы законнасці і абгрунтаванасці крымінальнага праследавання памерлай асобы з удзелам яе блізкіх сваякоў у судовым парадку, выключаюць магчымасць рэабілітацыі памерлага грамадзяніна для абароны яго годнасці і гонару.

4. Рэспубліка Беларусь забяспечвае законнасць і правапарадак; дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры для стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй (частка трэцяя артыкула 1, частка першая артыкула 59 Канстытуцыі).

Указаным палажэнням Канстытуцыі адпавядае норма часткі 2 артыкула 7 КПК, згодна з якой устаноўлены дадзеным Кодэксам парадак вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе прызваны забяспечыць законнасць і правапарадак, папярэджанне злачынстваў, абарону ад неабгрунтаванага абвінавачання або асуджэння, незаконнага абмежавання правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, а ў выпадку абвінавачання або асуджэння невінаватага — неадкладную і поўную яго рэабілітацыю, пакрыццё яму фізічнай, маёмаснай і маральнай шкоды, аднаўленне парушаных працоўных, пенсійных, жыллёвых і іншых правоў. У адпаведнасці з часткай 1 артыкула 27 КПК орган крымінальнага праследавання ў межах сваёй кампетэнцыі абавязаны ўзбудзіць крымінальную справу ў кожным выпадку выяўлення прыкмет злачынства, прыняць усе прадугледжаныя законам меры да ўстанаўлення прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння, выкрыцця асоб, вінаватых ва ўчыненні злачынства, і іх пакарання, роўна як прыняць меры па рэабілітацыі невінаватага.

Такім чынам, у сілу норм КПК рэабілітацыі падлягаюць невінаватыя асобы ў выпадку іх незаконнага абвінавачання або асуджэння. Аднак пры адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы або спыненні вядзення па ўзбуджанай справе ў адносінах да памерлай асобы з канстатацыяй яе вінаватасці ў здзяйсненні грамадска небяспечнага дзеяння, якое цягне крымінальную адказнасць, могуць парушацца такія прыналежныя такой асобе канстытуцыйныя правы, як годнасць і гонар асобы.

У раздзеле 48 «Вядзенне па пакрыцці шкоды, прычыненай фізічнай або юрыдычнай асобе незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс» КПК прадугледжана, што орган, які вядзе крымінальны працэс, у выпадку прызнання яго дзеянняў і рашэнняў незаконнымі абавязаны прыняць меры па пакрыцці фізічнай, маёмаснай і маральнай шкоды, прычыненай фізічнай асобе, і па аднаўленні парушаных працоўных, пенсійных, жыллёвых, іншых асабістых немаёмасных правоў фізічнай асобы (частка 2 артыкула 460).

З аналізу зместу пункта 7 часткі 1 артыкула 29, часткі 1 артыкула 250, часткі 1 артыкула 279 і пункта 1 часткі 1 артыкула 303 КПК вынікае, што адмова ва ўзбуджэнні крымінальнай справы, спыненне папярэдняга расследавання, спыненне вядзення па крымінальнай справе суддзёй пры назначэнні судовага пасяджэння або судом у судовым пасяджэнні ў сувязі са смерцю падазронага або абвінавачванага не павінны з'яўляцца перашкодай для рэабілітацыі такой асобы ў выпадку прычынення шкоды незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс, у прыватнасці для аднаўлення такіх асабістых немаёмасных правоў, як годнасць і гонар асобы.

5. Згодна з артыкулам 22 Канстытуцыі ўсе роўныя перад законам і маюць права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў.

Замацаванне ў частцы 3 артыкула 29 КПК нормы, у адпаведнасці з якой спыненне вядзення па крымінальнай справе па падставах, устаноўленых у пунктах 3 і 4 часткі 1 дадзенага артыкула (за выключэннем тэрмінаў даўнасці або з прычыны акта амністыі), дапускаецца толькі са згоды падазронага або абвінавачванага, сведчыць аб рэалізацыі такіх канстытуцыйных прынцыпаў, як прэзумпцыя невінаватасці, права кожнага на абарону годнасці і гонару, гарантаванне абароны правоў і свабод у судовым парадку.

Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, нормы пунктаў 3 і 4 артыкула 29 КПК маюць падобны характар з нормай пункта 7 часткі 1 дадзенага артыкула, паколькі прадугледжваюць акалічнасці, якія выключаюць вядзенне па крымінальнай справе па нерэабілітуючых падставах. Аднак калі спыненне вядзення па крымінальнай справе па падставах, указаных у пунктах 3 і 4 часткі 1 артыкула 29, дапускаецца толькі са згоды падазронага або абвінавачванага, то ў выпадку спынення вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да памерлай асобы (пункт 7 часткі 1 указанага артыкула) такая асоба па прычыне смерці пазбаўлена магчымасці заявіць пярэчанні з мэтай абароны сваіх годнасці і гонару, а атрыманне згоды яе блізкіх сваякоў у КПК не прадугледжана.

Выкладзенае сведчыць аб розных падыходах заканадаўца да рэгулявання крымінальна-працэсуальным законам падобных праваадносін, звязаных са спыненнем вядзення па крымінальнай справе па нерэабілітуючых падставах, што абумоўлівае неабходнасць рэалізацыі ў крымінальна-працэсуальным законе ў поўнай меры канстытуцыйнага палажэння аб роўнасці ўсіх перад законам і праве на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў.

6. Канстытуцыйны Суд адзначае, што права на судовую абарону, замацаванае ў артыкуле 60 Канстытуцыі, падразумявае наяўнасць канкрэтных прававых механізмаў эфектыўнага аднаўлення ў правах. З аналізу зместу дадзенага артыкула ва ўзаемасувязі яго з артыкуламі 6, часткай першай артыкула 109 і часткай першай артыкула 115 Канстытуцыі аб самастойнасці судовай улады, якая належыць у Рэспубліцы Беларусь судам, аб ажыццяўленні правасуддзя на аснове спаборнасці і роўнасці бакоў у працэсе вынікае, што канстытуцыйнае права на судовую абарону — гэта права не толькі на зварот у суд, але і на атрыманне рэальнай абароны ў выніку ажыццяўлення судовай улады пры дапамозе пэўных відаў судаводства.

У адпаведнасці з прынцыпам, замацаваным у частцы першай артыкула 115 Канстытуцыі, у крымінальным працэсе правасуддзе ажыццяўляецца на аснове спаборнасці і роўнасці бакоў абвінавачання і абароны (частка 1 артыкула 24 КПК); для забеспячэння роўнасці правоў бакоў у судовым разборы дзяржаўны, прыватны абвінаваўца, абвінавачваны, яго абаронца і законны прадстаўнік, а таксама пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі карыстаюцца роўнымі правамі на заяву адводаў і хадайніцтваў, прадстаўленне доказаў, удзел у іх даследаванні, выступленне ў судовых спрэчках, а таксама на ўдзел у разглядзе іншых пытанняў, якія ўзнікаюць пры судовым разборы крымінальнай справы (артыкул 292 КПК).

Па хадайніцтве абвінавачванага вызначэннем (пастановай) суда ў якасці абаронцы ў судзе можа быць дапушчаны адзін з блізкіх сваякоў або законных прадстаўнікоў абвінавачванага (частка 3 артыкула 44 КПК). Аднак у выпадку смерці падазронага або абвінавачванага яго блізкія сваякі пазбаўлены магчымасці ажыццявіць яго абарону ў крымінальным працэсе і, значыць, заявіць хадайніцтва аб рэабілітацыі памерлай асобы, а таксама рэалізаваць іншыя паўнамоцтвы абаронцы, што сведчыць аб наяўнасці фактычнай няроўнасці бакоў абвінавачання і абароны ў крымінальным працэсе.

Акрамя таго, аб фактычнай няроўнасці бакоў абвінавачання і абароны сведчыць тая акалічнасць, што згодна з часткай 4 артыкула 49 КПК па справах аб злачынствах, вынікам якіх з'явілася смерць пацярпелага, правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 50 дадзенага Кодэкса, ажыццяўляюць члены яго сям'і, блізкія сваякі або законныя прадстаўнікі, тады як у выпадку смерці падазронага або абвінавачванага яго блізкія сваякі пазбаўлены магчымасці абараняць у рамках крымінальнага працэсу замацаваныя ў Канстытуцыі немаёмасныя правы асобы.

У адпаведнасці з артыкуламі 138 КПК дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, могуць быць абскарджаны ва ўстаноўленым дадзеным Кодэксам парадку ўдзельнікамі крымінальнага працэсу, а таксама іншымі фізічнымі і юрыдычнымі асобамі, калі працэсуальныя дзеянні, што праводзяцца, і рашэнні закранаюць іх інтарэсы.

Спыненнем крымінальнага праследавання па такой нерэабілітуючай падставе, як смерць падазронага або абвінавачванага, могуць быць закрануты як немаёмасныя (годнасць, гонар, добрае імя), так і маёмасныя (у прыватнасці, у выпадку прад'яўлення патрабаванняў да маёмасці, што атрымліваецца ў спадчыну, або да наследнікаў, якія атрымалі спадчынную маёмасць) правы блізкіх сваякоў памерлай асобы.

Такім чынам, блізкія сваякі памерлай асобы маюць права абскардзіць дзеянні і рашэнні органа, што вядзе крымінальны працэс, толькі ў той частцы, у якой закранаюцца іх законныя інтарэсы.

На падставе выкладзенага Канстытуцыйны Суд прыходзіць да высновы аб тым, што ў выпадку адмовы ва ўзбуджэнні крымінальнай справы, спынення папярэдняга расследавання або спынення вядзення па крымінальнай справе пры назначэнні суддзёй судовага пасяджэння, а таксама ў судовым пасяджэнні, акрамя выпадкаў, калі вядзенне па крымінальнай справе неабходна для рэабілітацыі памерлай асобы, не адпавядаючымі частцы першай артыкула 25, артыкулам 26, 28 і 60 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у той меры, у якой гэтыя палажэнні ў сістэме дзеючага заканадаўства дазваляюць органу, які вядзе крымінальны працэс, у выпадку смерці падазронага або абвінавачванага адмовіць ва ўзбуджэнні крымінальнай справы, а па ўзбуджанай справе спыніць вядзенне без згоды яго блізкіх сваякоў.

2. Гэта Заключэнне ўступае ў сілу з дня яго абвяшчэння, з'яўляецца канчатковым, абскарджанню і апратэставанню не падлягае, дзейнічае непасрэдна і не патрабуе пацвярджэння іншымі дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі, службовымі асобамі.

3. Апублікаваць гэта Заключэнне ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Старшынствуючы —
Старшыня Канстытуцыйнага Суда
Рэспублікі Беларусь
П.П. МІКЛАШЭВІЧ

12 чэрвеня 2014 г. г. Мінск
№ З-928/2014

ВЫРАШЫЎ:

1. Прызнаць палажэнні пункта 7 часткі 1 артыкула 29, часткі 1 артыкула 250, часткі 1 артыкула 279 і пункта 1 часткі 1 артыкула 303 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюць, што крымінальная справа ў адносінах да памерлай асобы не можа быць узбуджана, а па ўзбуджанай справе падлягаюць спыненню папярэдняе расследаванне і вядзенне па крымінальнай справе пры назначэнні суддзёй судовага пасяджэння, а таксама ў судовым пасяджэнні, акрамя выпадкаў, калі вядзенне па крымінальнай справе неабходна для рэабілітацыі памерлай асобы, не адпавядаючымі частцы першай артыкула 25, артыкулам 26, 28 і 60 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у той меры, у якой гэтыя палажэнні ў сістэме дзеючага заканадаўства дазваляюць органу, які вядзе крымінальны працэс, у выпадку смерці падазронага або абвінавачванага

Краіна здароўя

Выпуск № 10 (321)

■ Доктар адкажа

ЖАЛЕЗА Ў ДЭФІЦЫЦЕ

«Што можа быць прычынай дэфіцыту жалеза? Як эфектыўна палепшыць гэты паказчык крыві?

Марына, г. Магілёў».

Тлумачыць **урач-тэрапеўт 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Уладзімір ЛАПІЦКІ:**

— Праблема, аб якой вы кажаце, называецца анеміяй — гэта змяншэнне гемаглабіну ў крыві. Разам з гемаглабінам пры анеміі змяншаецца звычайна і колькасць чырвоных крывяных цельцаў — эрытрацытаў. У большасці выпадкаў анемія — не самастойнае захворванне, а сімптом, праява іншага захворвання. Скажам, захворванні страўнікава-кішачнага тракта (язва страўніка і дванаццаціперснай кішкі, хранічны гастрыт, неспецыфічны язвавы каліт), злучальнай тканкі (рэўматоідны артрыт, сістэмная чырвоная ваўчанка) або хранічнай ныркавай недастатковасці, злаякаснага новаўтварэння, хранічнага інфекцыйнага захворвання, гельмінтозу. Выклікаць анемію могуць кровастраты, звязаныя з ужываннем некаторых лекавых прэпаратаў (саліцылавая кіслата, нестэроідныя супрацьзапаленчыя сродкі, глюкакортыкастэроіды).

Да найбольш уразлівых пацыентаў адносяцца дзеці малодшага ўзросту, цяжарныя, жанчыны дзетароднага ўзросту, старыя людзі. Анемія ўскладняе цяжарнасць і роды, правакуе невыношванне цяжарнасці. Магчымае і нараджэнне дзіцяці з нізкай вагой.

Часцей за ўсё дыягнастуецца жалезадэфіцытная анемія, пры якой у арганізме не хапае аднаго з асноўных кампанентаў гемаглабіну — жалеза. Запасы жалеза змяшчаюцца, галоўным чынам, у касцявым мозгу і селязёнцы. Астатняе захоўваецца ў выглядзе ферыціну (бялку, у складзе якога жалеза назапашваецца ў тканках).

Жалезадэфіцытныя станы зніжаюць працаздольнасць, павялічваюць успрымальнасць да вострых рэспіраторных захворванняў. Характэрна галавакружэнне, шум у вушах, «мошкі» перад вачыма, павышаная стамляльнасць, галаўны боль, ломкасць і папярэчная скрэсленасць пазногцяў, выпадзенне валасоў, трэшчыны вакол рота. Ёсць і іншыя прыкметы: бледныя скура і слізістыя, сэрцабіццё, задышка падчас фізічнай нагрузкі.

У большасці выпадкаў зніжэнне ўзроўню гемаглабіну адбываецца паступова, арганізм адаптуецца да анеміі і скаргі не заўсёды адпавядаюць паказчыкам гемаглабіну. Некаторыя наогул нічога не адчуваюць, а таму могуць ні на што не скардзіцца ўрачу. Іншых жа непакояць слабасць, задышка, галавакружэнне, страта прытомнасці. Пры цяжкай анеміі можа развіцца сардэчная недастатковасць, пачашчанае сэрцабіццё, ацёкі, зніжэнне артэрыяльнага ціску.

Распазнаванне заснавана на выяўленні змен у аналізах крыві: зніжэнне ўзроўню гемаглабіну, эрытрацытаў, колеравага паказчыка, змяненне формы і памераў эрытрацытаў, значнае зніжэнне жалеза ў сываратцы крыві.

Пры анеміі паказчык гемаглабіну меншы за 110 г/л, колеравы паказчык — меншы за 0,95, узровень жалеза сываратцы меншы за 10 ммоль/л. Гемаглабін і ферыцін лічацца найбольш інфарматыўнымі паказчыкамі для дыягностыкі жалезадэфіцыту.

Урачы кажуць, што анемія працякае ў лёгкай форме пры гемаглабіне 90-110 г/л, сярэдняй цяжкасці — пры 80-89 г/л, цяжкай — пры ніжэйшым за 80 г/л.

Лячэнне — комплекснае. На некалькі месяцаў і больш прызначаюцца прэпараты жалеза, рэкамендуецца звярнуць увагу на харчаванне. У рацыёне павінна быць дастаткова паўнацэнных бялкоў, якія спрыяюць сінтэзу гемаглабіну і эрытрацытаў (130 г, з якіх 80-95 г — жывёльнага паходжання). Да 70-80 г абмяжоўваецца тлушч, паколькі пры анеміі часта адзначаюцца змены ў печані і атлусценне касцявога мозгу. Таму неабходна ўжываць нятлустае мяса, нятлустую рыбу, тварог, грэцкую і аўсяную кашы, алей.

Колькасць вугляводаў у дыеце пры анеміі — 400-500 г у дзень. Гэта могуць быць крупы, цукар, мёд, агародніна, садавіна, ягады. У раслінных прадуктах шмат вітамінаў, неабходных арганізму ў такі час.

Для атрымання вітамінаў групы В у рацыён уключаюць яечны жаўток, стравы з печані, мяса, рыбы, тварагу, пшанічнага і рысавага вотруб'я. Вельмі важны вітамін С. Аскарбінавай кіслаты шмат у шыпшыне, чорных парэчках, цытрусавых. У кроватварэнні ўдзельнічаюць не толькі жалеза, але і кобальт, марганец, цынк, якія можна атрымаць з печанню, мясам, яйкамі, ікрой, дражджамі, гематагенам, пшанічнай мукой, аўсянай і грэцкай крупамі, агароднінай, садавіной, грыбамі, какавай.

Пры анеміі апетыт часта бывае аслаблены — з-за зніжэння сакраторнай функцыі страўніка. Каб палепшыць апетыт, рэкамендуецца ўжываць мясныя, рыбныя, грыбныя, агароднінныя супы, адвары, дадаваць соусы, выкарыстоўваць фізіялагічную колькасць солі.

АСНОЎНЫЯ ПРЫЧЫНЫ ЖАЛЕЗАДЭФІЦЫТНАЙ АНЕМІІ:

— хранічныя кровастраты (язвавая хвароба страўніка і дванаццаціперснай кішкі, неспецыфічны язвавы каліт, вострыя і хранічныя эрозіі страўніка, гемарой, матачныя і насавыя кровацячэнні);

— парушэнні ўсмоктвання жалеза ў кішэчніку (энтэрыты);

— павышаная патрэба ў жалезе (падчас цяжарнасці і груднога кармлення);

— недастатковае паступленне жалеза з харчовымі прадуктамі, нізкае ўжыванне бялку.

■ Жаночае пытанне

КАЛІ ПАЛІП ЁСЦЬ, А ПРАЯЎ — НЯМА

Такое дабраякаснае ўтварэнне, як паліп эндаметрыя, можа ўзнікнуць у любым узросце

Аднак у большасці выпадкаў выяўляецца яно пасля 35 гадоў. Прычыны ўзнікнення такіх утварэнняў не вядомыя. Вылучаюць толькі фактары, якія павышаюць рызыку развіцця захворвання. Гэта гарманальныя парушэнні, пры якіх павышаны ўзровень эстрагену і паніжаны — прагестэрону; траўмы поласці маткі — шматлікія дыягнастычныя выскрабанні, аборты, працяглае выкарыстанне ўнутрыматачнай спіралі, выкідышы, роды, пасля якіх у поласці маткі засталіся ўчасткі плацэнты, згусткі крыві, якія паступова замяніліся злучальнай тканкай і ўтварылі паліп; эндакрынныя парушэнні (цукровы дыябет, тырэатаксікоз); экстрагенітальныя захворванні (гіпертанія, атлусценне).

— Пры невялікіх памерах паліпа захворванне можа ніяк не праяўляцца, — расказвае **загадчыца жаночай кансультацыі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Людміла СЦЕПАНЕНКА.** — Утварэнне ў поласці маткі часцей за ўсё з'яўляецца «выпадковай знаходкай» падчас ультрагукавога абследавання органаў малога таза. Калі ж паліп вялікі або іх некалькі, то могуць заявіць аб сабе парушэнні менструальнага цыкла, а дакладней, перыядычнае з'яўленне невялікіх выдзяленняў паміж месячнымі. У многіх маладых жанчын паліпоз эндаметрыя праяўляецца празмернымі менструальнымі крывацёкамі. У жанчын у перыядзе постменапаўзы могуць быць аднаразовыя выдзяленні крыві. Некаторыя жанчыны скардзяцца на боль унізе жывата, які можа ўзмацняцца падчас палавога акта. Белаватыя моцныя выдзяленні з палавых шляхоў могуць быць выкліканы паліпам вялікіх памераў. Назіраюцца і так званыя кантактныя крывацёкі — сукравічныя выдзяленні пасля палавога акта. У жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту ў многіх выпадках рэгіструецца бясплоднасць. Некаторыя ўрачы не бачаць дакладнай сувязі паміж паліпам эндаметрыя і праблемай зачацця дзіцяці, аднак даказана, што выдаленне паліпа павышае шанцы жанчыны зацяжарацьць.

Пералічаныя сімптомы вельмі падобныя на прыкметы міёмы маткі, эндаметрыёзу або пагрозы выкідышу на раннім тэрміне цяжарнасці. Таму пры з'яўленні пералічаных сімптомаў неабходна тэрмінова звярнуцца да гінеколага.

Асноўны спосаб лячэння паліпаў эндаметрыя — аператыўнае выдаленне гэтых утварэнняў, або гістэраскапія. Маніпуляцыя выконваецца спецыяльным аптычным інструментам — гістэраскопам, які ўводзіцца ў поласць маткі. Саскрэб са сценкі маткі, атрыманы падчас маніпуляцыі, абавязкова накіроўваецца на гісталагічнае даследаванне для вызначэння тыпу паліпа. Ад тыпу паліпа і ўзросту жанчыны залежыць тактыка лячэння. Калі выяўляецца фіброзная структура паліпа, то ў наступнай гарманальнай тэрапіі няма неабходнасці. Пры жалезіста-фіброзных і жалезістых паліпах эндаметрыя паказана гарманальная тэрапія для нармалізацыі менструальнага цыкла і гарманальнага балансу.

Гарманальныя прэпараты прызначаюцца на 3-6 месяцаў. Эстраген-гестагенныя камбінаваныя аральныя кантрацэптывы падыходзяць жанчынам да 35 гадоў. Гестагены звычайна прызначаюцца жанчынам пасля 35-ці. Унутрыматачная сістэма «Мірэна», якая вызваляе гармон леваноргестрэл у поласць маткі, прапануецца жанчынам, якія не плануюць цяжарнасць у бліжэйшыя 5 гадоў.

Радыкальнага падыходу ў лячэнні патрабуе выяўленне адэнаматознай формы паліпозу эндаметрыя, паколькі гэта форма захворвання лічыцца перадракавым станам. Жанчынам пасля 45 гадоў паказана выдаленне маткі, а пры спалучэнні захворвання з эндакрыннымі парушэннямі і пры павышанай анкалагічнай насцярожанасці рэкамендуецца выдаленне маткі з прыдаткамі. Жанчынам рэпрадуктыўнага ўзросту магчыма прызначэнне гарманальнай тэрапіі пасля выскрабання, але ў постменапаўзальным узросце неабходна зноў вярнуцца да пытання аб аператыўным лячэнні.

■ Асабістая гігіена

АДНЫМ СЛОВАМ, ПАРАЗІТЫ...

Гельмінтозы ставяць на чацвёртае месца па ступені шкоды для здароўя (пасля ішэмічнай хваробы сэрца, дыярэі і туберкулёзу). Лічыцца, што гельмінтамі інфіцыравана вельмі значная частка насельніцтва.

Найбольш часта ў нашай краіне сустракаюцца каля 10 відаў гельмінтаў, або глістоў, з якіх найбольш шырока распаўсюджаны аскарыды, воласагаловы, астрыцы. Пасяляюцца гэтыя паразіты ў кішэчніку і выклікаюць адпаведныя захворванні. Заражэнне адбываецца галоўным чынам праз дрэнна памытыя рукі, садавіну-агародніну, дрэнна апрацаваныя мяса і рачную рыбу. У хворых, як правіла, зніжаецца апетыт, з'яўляецца млосць, ваніты, боль у жываце, паносы або запоры. Адзначаюцца таксама галаўны боль, слабасць, раздражняльнасць, зрэдку — непраходнасць кішэчніка. Паводле слоў **валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ,** асабліва пакутуюць дзеці — у іх запавольваецца рост і прыбаўка ў вазе, яны пачынаюць часцей хварэць на інфекцыі.

АБАРАНІЦЬ СЯБЕ АД ГЛІСНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ НЕ ТАК СКЛАДАНА:

✓Мыйце рукі перад ядой, пасля карыстання туалетам і кожнага забруджвання, пасля гульні са свойскімі жывёламі.

✓Не грызіце пазногцяў.

✓Дасканала мыйце сырую агародніну і садавіну перад ядой у праточнай вадзе, абдавайце іх кіпенем.

✓Выкарыстоўвайце толькі бутыляваную або гатаваную ваду.

✓Абясшкоджвайце нечыстоты ў ямах, каб не было доступу кісларoду. Пры захоўванні ў выграбных ямах звыш 6 месяцаў яйкі гельмінтаў гінуць.

✓Змагайцеся з мухамі, абараняйце ад іх прадукты харчавання.

✓Сачыце за чысцінёй абутку, бялізны, адзення.

✓Набывайце мяса з адзнакай аб ветэрынарным кантролі.

✓Добра смажце/варыце мяса і рыбу.

Заразіцца, напрыклад, трыхінеламі можна пры ўжыванні свініны і дзічыны (мяса дзіка, мядзведзя). У такога хворага баліць галава, павышаецца тэмпература, ацякаюць павекі, твар становіцца адутлаватым, праз тыдзень пачынаюць балець мышцы, канечнасці, цяжка становіцца дыхаць, размаўляць, на целе з'яўляецца высыпка.

Заразіцца іншымі гельмінтамі можна пры ўжыванні недастаткова прасмажанага ці праваранага мяса буйной рагатай жывёлы, пры каштаванні сырога фаршу. Небяспечнай можа быць недастаткова прасмажаная або недасоленая рачная рыба з лічынкамі паразіта.

Глісты могуць перадавацца насякомымі, кошкамі, сабакамі. Заражэнне адбываецца праз рот — з вадой, пылам; праз нямытыя рукі, брудныя прадукты, падчас хады басанож або ляжання на зямлі. Гельмінты сабак могуць перадацца чалавеку праз тыя ж брудныя рукі, нямытую агародніну, ягады, ваду. Сімптомаў тут можа быць шмат, але асноўнымі лічацца павышэнне тэмпературы, сухі кашаль, сып.

Гельмінты выклікаюць розныя паталагічныя змяненні ў арганізме чалавека: ад механічнага ўздзеяння на тканкі і органы да інтаксікацыі; ад парушэння балансу вітамінных і мінеральных рэчываў да алергіі, зніжэння імунітэту.

Дыягностыка заснавана ў тым ліку і на лабараторных даследаваннях. Выявіць паразітаў можна і з дапамогай імуналагічнага даследавання крыві, калі выяўляюцца спецыфічныя антыцелы да гельмінтаў.

Для лячэння прымяняюць спецыяльныя супрацьгліставыя прэпараты, выбар якіх залежыць ад канкрэтнага віду выяўленых гельмінтаў.

■ Сезонныя парады

РУКІ! МЫЛІ?

Не забывайце, што летам так лёгка стаць ахвярай вострых кішэчных інфекцый.

1. Бахчавыя культуры не набывайце ў разрэзаным выглядзе, паколькі мікраарганізмы з паверхні лёгка пераносяцца і размнажаюцца ў мякаці.

2. Садавіну, агародніну, ягады трэба дасканала мыць пад праточнай вадой.

3. Усе харчовыя прадукты павінны захоўвацца закрытымі ў чыстым посудзе. Гатовыя — асобна ад сырых.

4. Салаты трэба есці ў бліжэйшы час пасля гатавання, іх тэрмін захоўвання — да 12 гадзін.

5. Харчовыя прадукты, якія засталіся на наступны дзень, неабходна падвяргаць тэрмічнай апрацоўцы.

6. Малако, набытае на рынку, у прыватных асоб, можна ўжываць толькі пасля гатавання.

7. Не гатуйце і не ешце, пакуль не вымылі рукі з мылам.

■ Сексуальны лікбез

ТОЛЬКІ ПАЧУЦЦЯЎ МАЛА,

або Чаго насамрэч хочуць мужчыны і жанчыны?



Сексуальнасць чалавека рэалізуецца ў першую чаргу праз сексуальныя стасункі з партнёрам. Таму гаворачы пра якасць сексу, мы павінны гаварыць пра якасць гэтых стасункаў. Для іх апісання спецыялісты выкарыстоўваюць паняцце сексуальнай гармоніі. У каго ёсць такая гармонія — даведаемся ад урача-сексолага Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Мікалая ХВАШЧЫНСКАГА.

— Сексуальная гармонія ёсць, калі палавое жаданне і актыўнасць у пары прыводзяць да аптымальнага зліцця эратычных адчуванняў, да аргазму, поўнага псіхасексуальнага задавальнення абодвух партнёраў! Словам, якасны секс указвае на гарманічныя сексуальныя стасункі. На першы погляд усё даволі проста: было б жаданне — астатняе прыкладзецца... Аднак моцныя ўзаемныя пачуцці — яшчэ не гарантыя паспяховасці ў інтымным жыцці.

Для сапраўднай гармоніі ў пары патрабуецца супадзенне вельмі многіх рэчаў — агульнай культуры, каштоўнасцяў, маральных прынцыпаў... Важнае і супадзенне этнічных асаблівасцяў, матываў інтымнай блізкасці, стыляў мужчынскіх і жаночых паводзін, псіхасексуальных тыпаў (хто «лідар», а хто «падпарадкаваны»), ідэалізаваных фантазій аб сумесным жыцці і сямейнай структуры. Што да наяўнасці ўзаемнага кахання, глыбокай эмацыянальнай сувязі, спалучэння рыс характару, то гэта, безумоўна, толькі ўзбагачае сексуальнае жыццё.

Павысяць якасць сексу і супадзенне палавых тэмпераментаў партнёраў, адсутнасць адрозненняў у індывідуальных біярытмах, падабенства ўяўленняў аб псіхафізіялогіі мужчынскай і жаночай сексуальнасці, веданне яе ўзроставых і фізіялагічных асаблівасцяў. Існуюць і «тэхнічныя» крытэрыі якасці сексуальных адносін — адсутнасць стэрэатыпаў у палавым жыцці, супадзенне сексуальных інтарэсаў. Не будзем скідваць з рахунку і разуменне сексуальных жаданняў партнёра, адэкватнае выражэнне сваіх уласных, уменне прыстасоўваць палавыя патрэбы ў пары.

— Мужчына і жанчына заўсёды па-рознаму глядзяць на секс. У гэтым сэнсе існуе і мноства міфаў. А чаго ж на самой справе хочуць адны і другія?

— Вядома, у сексуальнасці мужчын і жанчын ёсць адрозненні. Традыцыйна лічыцца, што для моцнай паловы характэрнае больш выражанае сексуальнае жаданне, сексуальная агрэсіўнасць, напорыстасць, нястрымнасць. Больш частыя сексуальныя думкі і фантазіі: 12-19-гадовыя юнакі пастаянна думаюць пра секс, мужчыны 40-50 гадоў — недзе раз у паўгадзіны. Мужчыны не так моцна эмацыянальна ўцягваюцца ў інтымныя адносіны. Яны больш схільныя да сексуальнай разнастайнасці і «кароткіх» сувязяў — вельмі спрэчны, дарэчы, тэзіс. У іх больш выражаная рэакцыя на візуальныя сексуальныя стымулы — тое, што называюць «любіць вачыма». Асноўны матыў палавой блізкасці — сексуальнае жаданне. Мужчыны аддаюць перавагу сексу перад іншымі заняткамі і гатовы ахвяраваць многімі рэсурсамі дзеля сексу. Характэрная і «выканаўчая трывожнасць» — сумненні ў сваім майстэрстве, страх перад магчымай сексуальнай няўдачай. У мужчын больш высокія сексуальныя запыты і меншая сексуальная задаволенасць. Пік сексуальнай актыўнасці назіраецца ва ўзросце 20-25 гадоў. Гэта, так бы мовіць, агульныя характарыстыкі. Не варта гэта ўспрымаць літаральна да кожнага асобнага мужчыны...

Гэткім жа чынам можна сказаць, што ў цэлым для жаночай сексуальнасці характэрная залежнасць сексуальнай задаволенасці ад якасці стасункаў з партнёрам (у шчаслівых шлюбах жанчыны часцей указваюць на наяўнасць аргазму). Асноўны матыў палавой блізкасці — пачуцці, каханне. Характэрны і мацярынскі інстынкт, вельмі значным будзе першы сексуальны вопыт. Росквіт сексуальнасці адбываецца павольна. У першыя тры месяцы пасля замужжа каля 20 працэнтаў жанчын перажываюць аргазм, праз 10 гадоў — 90 працэнтаў. Жанчыны, у сваю чаргу,

Большасць секс-стэрэатыпаў звязаныя, вядома, з сексуальнасцю мужчынскай: «сапраўдны мужчына праяўляецца найперш у сексе»; «мужчына заўсёды жадае і заўсёды гатовы да сексу»; «у сапраўднага мужчыны няма сексуальных праблем».

«любяць вушамі» — больш рэагуюць на аўдыяэратычныя стымулы. Адсутнасць аргазму для жанчыны не выключае магчымасці перажывання сексуальнай задаволенасці. Цікавая сувязь лібіда і аргазму з узроўнем адукацыі і прафесіяй. Так, у жанчын-гуманітарыяў лібіда і аргазм больш моцныя, чым у хатніх гаспадынь. А пік жаночай сексуальнай актыўнасці прыпадае на ўзрост пасля 30.

Большасць секс-стэрэатыпаў звязаныя, вядома, з сексуальнасцю мужчынскай: «сапраўдны мужчына праяўляецца найперш у сексе»; «мужчына заўсёды жадае і заўсёды гатовы да сексу»; «у сапраўднага мужчыны няма сексуальных праблем»; «у сексе мужчына не павінен слухаць жанчыну»; «чым больш жанчын і палавых актаў, тым лепш»; «адмовіцца ад сексу — распісацца ў сваёй няздольнасці як мужчыны»; «мужчына павінен «давесці» партнёрку да аргазму»; «інтымная блізкасць — гэта працяглы палавы акт, пяшчота — другасная».

Цікава, што часам не толькі самі мужчыны, але і жанчыны культывуюць ды ўсяляк «замацоўваюць» у сваёй свядомасці падобныя міфы.

— Што хутчэй «забівае секс» у асобнай пары: шлюб, нараджэнне дзяцей, злоўжыванне алкаголем?

— Наогул існуе шмат прычын, якія «забіваюць» секс. Спецыялісты дзеляць іх на псіхагенныя і арганічныя. Скажам, гэта могуць быць нейкія «сітуацыі»: неспрыяльныя ўмовы для інтымных адносін, страх перад цяжарнасцю ці венерычным захворваннем, псіхічная і фізічная стомленасць, алкагольнае ап'яненне. Нашкодзіць могуць і псіхічныя траўмы, звязаныя з успамінамі аб колішніх сексуальных няўдачах, нейкія апасенні адносна няздольнасці задаволіць партнёра, страх пацярпець фіяска падчас палавой блізкасці. Асобны момант — праблемы ў пары, бытавыя канфлікты, недавер, рэўнасць, абыякавасць, абразы, страта павагі адзін да аднаго. Могуць быць і асабістыя праблемы — трывожныя рысы характару, заніжаная самаацэнка, схільнасць да самаедства, залішняя адказнасць за поспех інтымных адносін, памылковыя ўяўленні аб палавым жыцці.

Аднак секс становіцца немагчымым і пры некаторых захворваннях, якія, скажам, парушаюць кровазварот у палавых органах, — атэрасклероз, цукровы дыябет. Нельга забывацца і на зніжэнне выпрацоўкі палавых гармонаў з узростам. Тытунь, алкаголь, наркотыкі з цягам часу таксама істотна пагаршаюць сітуацыю і не стасуюцца з нармальным сексуальным жыццём.

Той, хто клапоціцца аб наяўнасці сексуальнай гармоніі ў сваім жыцці, павінен, у прынцыпе, сачыць за сваім фізічным здароўем, своечасова вырашаць псіхалагічныя праблемы — з дапамогай псіхолага, псіхатэрапеўта ці сексолага. Гэта зусім не складана, калі з павагай ставішся да сябе і партнёра.

— Ці расце ў нас колькасць сексуальных расстройстваў, паталогій? Як можна ацаніць сексуальнае здароўе сучасных мужчын і жанчын?

— Рост колькасці звароткаў па сексалагічную дапамогу абумоўлены найперш павышэннем агульнага культурнага і адукацыйнага ўзроўню насельніцтва. Сёння да ўрачоў-сексолагаў звяртаюцца мужчыны і жанчыны ад 18 да 80 гадоў. Аднак і аб'ектыўна колькасць сексуальных парушэнняў будзе расці, паколькі жыццё сучаснага чалавека прасякнутае моцнымі псіхічнымі перагрузкамі, а распаўсюджванне захворванняў сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сістэм істотна пагаршае сітуацыю.

— «Секс-цацкі», спецыяльныя прыстасаванні для сексуальных гульняў сапраўды робяць палавое жыццё больш разнастайным?

— А вы падумайце, ці можна зрабіць больш разнастайнай любоў да свайго дзіцяці... Любоў або ёсць, або яе няма. Ніякая новая «цацка» яе не стварае. З сексуальнымі стасункамі тое ж самае. Калі ёсць моцнае пачуццё, яно не павінна дазволіць лібіда завязнуць у «быце». З іншага боку, ніхто не адмаўляе эксперыменты ў сексе. У пары дапушчальныя самыя разнастайныя формы сексуальных адносін. Патрэбны дзве ўмовы: узаемная згода дарослых, свядомых партнёраў і адсутнасць фізічнай або маральнай шкоды сабе, партнёру або іншым людзям.

Матэрыялы старонкі падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 2 (2)

Рэформа выпраўлення

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цікава, што сучасная ВК №19 у 1983 годзе пачынала сваю гісторыю як лячэбна-працоўны прафілакторый. Аднак праз 9 гадоў прафілакторый загадам міністра ўнутраных спраў ліквідавалі і на яго месцы арганізавалі выпраўленчую ўстанову.

— Першы асуджаны завезены ў калонію 1 чэрвеня 1993 года, — паглыбляецца ў гісторыю **Аляксандр ТАЎСТУХА, намеснік начальніка калоніі па выпраўленчым працэсе.** — Гэты дзень лічыцца ўтварэннем калоніі. За непрацяглы перыяд яна была і агульнага, і ўзмоцненага рэжыму. У апошнія гады сюды этапавалі так званых «першаходаў» — асоб, якія адбываюць пакаранне ва ўмовах агульнага ці ўзмоцненага рэжыму ўпершыню. Наш ліміт — 800 зняволеных. І з іх, як ужо казаў выканаўца абавязкаў начальніка калоніі, засталося не больш за сто асуджаных.

Усе яны ў калоніі заняты працай. Расклад чымсьці нагадвае армейскі: пад'ём у 6:30, адбой — 22:30. Усё зроблена дзеля таго, каб забяспечыць асуджаным 8-гадзінны бесперапынны сон. У прафілакторыі, зразумела, будзе крыху іншы графік.

— Наша прадпрыемства спецыялізуецца на дрэваапрацоўчай, швейнай, металаапрацоўчай вытворчасцях. Робім паддоны, драўляную тару, — тлумачыць **Дзмітрый ЛЯЎКОЎ, дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства ВК №19.** — Супрацоўнічаем пераважна з магілёўскімі арганізацыямі. Наша асноўная задача — забяспечыць падапечных працай, каб яны пакрывалі расходы, адпраўлялі грошы на ўтрыманне дзяцей. Працуюць у дзве змены ў адпаведнасці з васьмігадзінным працоўным днём.

У БІБЛІЯТЭЦЫ — ТВОРЫ РЭЯ БРЭДБЕРЫ

Тэрыторыя калоніі нібы падзелена на дзве зоны. І калі трапляеш на яе пляцоўку, злева бачыш памяшканні «атрадаў», «каранцін», медыцынскую часць, справа — пабудовы прадпрыемства. Аднак праз некалькі крокаў позірк трапляе на фігуру вялікага бялюткага лебедзя, якога ўсталявалі самі асуджаныя. Крыху далей — драўляны крыж, тут пазней пабудуюць праваслаўную каплічку. Нягледзячы на працоўны дзень, частка зняволеных, якіх выдае чорная ўніформа, не занята на вытворчасці і адказвае за парадак у атрадах. На вонкавых сценах жылога корпуса — не толькі спецыяльна падрыхтаваны расклад праграм тэлебачання, дзе найбольш часта сустракаюцца матчы футбольнага чэмпіянату свету, але і самадзейныя насценгазеты. Шосты нумар газеты «Прамень святла!», напрыклад, змяшчае спіс тых, хто атрымаў падзяку ад кіраўніцтва калоніі.

Сяргей ПРАЦЭНКА, першы намеснік начальніка Дэпартамента выканання пакарання Міністэрства ўнутраных спраў:

— Я добра памятаю, як магілёўскі лячэбна-працоўны прафілакторый перапрафілявалі ў выпраўленчую калонію. Напачатку 90-х разваліўся Савецкі Саюз, і ўсіх беларускіх асуджаных, якія адбывалі пакаранне ў іншых былых савецкіх рэспубліках, этапіравалі ў Беларусь. Выпраўленчая сістэма БССР была разлічана на меншую колькасць зняволеных, і нам прыйшлося звярнуцца да рэарганізацыі. Прайшло больш за 20 гадоў, і Прэзідэнт прыняў рашэнне зноў стварыць у Магілёве ЛПП. Прычына? Актыўнае прымяненне крымінальных пакаранняў, не звязаных з ізаляцыяй ад грамадства. Так, удзельная вага пазбаўлення волі ў структуры пакаранняў пераважае, але паступова ідзе яе змяншэнне. Вельмі важна, што і ў Магілёве, і ў Наваполацку, дзе таксама з'явіцца ЛПП, ёсць буйныя прадпрыемствы. Гэта дазволіць людзям, якія будуць знаходзіцца на лячэнні, працаваць. Сярэдні ўзрост спажыўцоў алкагольных напояў значна знізіўся. І калі раней у прафілакторыі накіроўвалі закаранелых п'яніц, цяпер там можна ўбачыць 18-гадовых маладзёнаў без адукацыі. У кожным лячэбна-працоўным прафілакторыі мы наладзілі спецыяльна-тэхнічнае навучанне, каб чалавек мог проста атрымаць прафесію. Як правіла, раней людзі злоўжывалі алкаголем і не працавалі. У сваю чаргу мы абавязаны прыцягнуць іх да працы. Што тычыцца новых лячэбна-працоўных прафілакторыяў, яны павінны запрацаваць да 1 верасня.

Як зрабіць адпачынак бяспечным?

Адпачывальнікам на беларускіх курортах варта асцерагацца не толькі зладзеяў, але і... саміх сябе

З надыходам доўгачаканага сезона водпускаў многія спяшаюцца хутчэй пакінуць каменныя джунглі, удыхнуць свежага паветра і нарэшце расслабіцца і забыцца на працу. Хтосьці аддае перавагу далёкім экзатычным краінам, а камусьці па душы адпачынак у Беларусі. Вось ужо шмат гадоў на слыху ва ўсіх маляўнічы курорт Нарач. Славутае возера прывабліве не толькі беларусаў, але і замежных турыстаў. Нашы эксперты расказалі не толькі пра спецыфіку сваёй працы на курорце, але і параілі, як зрабіць так, каб адпачынак прайшоў без вымушаных зносін з прадстаўнікамі службаў правапарадку і выратавальных станцый.

Віталь ФІЛІПОВІЧ, падпалкоўнік міліцыі, начальнік Мядзельскага РАУС:

— З прыездам адпачывальнікаў насельніцтва раёна, а гэта прыкладна 27 тысяч, павялічваецца ўдвая. Штогод разам з беларусамі адпачывае каля 30 тысяч замежнікаў. Сёлета Мядзельшчыну наведалі ўжо больш як 10 тысяч гасцей. І гэта не ўлічваючы грамадзян Расіі, Украіны, Літвы і Латвіі, якія могуць не рэгістравацца да 30 сутак. Наша задача — ва ўзаемадзеянні з мясцовымі ўладамі і супрацоўнікамі здраўніц стварыць людзям камфортныя ўмовы для адпачынку, забяспечыць ахову грамадскага парадку і дарожную бяспеку. Большасць здраўніц абсталявана камерамі відэаназірання. Дарэчы, менавіта камеры нядаўна дапамаглі раскрыць серыю крадзяжоў з гардэроба ў адной з устаноў курортнага пасёлка Нарач. Зламыснікамі аказаліся ўрач з суседняга раёна і яго брат, які атрымліваў адукацыю ў прэстыжнай сталічнай навучальнай установе.

Асноўныя здарэнні ў пасёлку Нарач — хуліганства і крадзяжы. Прычына большасці крадзяжоў — простая нядбайнасць людзей. Складанасць пры расследаванні такіх фактаў у тым, што пацярпелыя, сведкі, ды і зламыснікі могуць быць замежнікамі, і пасля заканчэння адпачынку ўсе яны раз'язджаюцца па дамах. Тым не менш за апошнія 7 гадоў на тэрыторыі раёна назіраецца зніжэнне колькасці злачынстваў, учыненых у грамадскіх месцах. Калі ў 2007 годзе іх было 97, то ў 2013-м — усяго 33. На жаль, некаторых нападпітку цягне да вады. А ў раёне ж больш як 50 азёр! Разам з АСВОДам нам пакуль удаецца прадухіляць няшчасныя выпадкі. А колькі тых, хто не ўмее паводзіць сябе на прыродзе! Пакідаюць смецце, паляць вогнішчы ў неналежных месцах. Паважаныя грамадзяне, вы ж прыедзеце сюды адпачываць зноў! Няўжо не сорамна пакідаць пасля сябе звалку?

Сяргей ЦЕЛЯК, начальнік выратавальнай станцыі «Нарач»:

— Мы дзяжурым круглыя суткі. На змену звычайна заступаюць тры вадалазы, матарыст, у летні час — матрос, медыцынскі работнік. Ёсць у нас і кіроўца. Пастаянна вядзём вахтавае назіранне за акваторыямі пляжа. Некаторыя адпраўляюцца на водную прагулку з алкаголем у сумцы. На мой погляд, неабходна прыцягваць да адказнасці тых, хто свядома падвяргае сябе небяспецы на вадзе. Пакуль мы можам толькі папярэджваць, угаворваць і ратаваць. А ахвотнікам паплаваць у першую чаргу хочацца пажадаць быць пільнымі і цвяроза ацэньваць сітуацыю. Плошча возера Нарач — каля 80 квадратных кіламетраў. Анамальны парывісты вецер і нават град для нашага раёна не рэдкасць. Бачнасць з берага можа быць нулявая, і выратавальнікі ў такіх умовах не маюць магчымасці адсочваць перасоўванне лодкі. Таму раю ўсім, акрамя камізэлькі, выратавальнага круга і адліўнога чарпака, абавязкова браць з сабой мабільны тэлефон, папярэдне яго зарадзіўшы, і ў выпадку НЗ тэлефанаваць у службу выратавання або ў міліцыю.

Андрэй КУПРЭВІЧ, маёр міліцыі, інспектар ДПС АДАІ Мядзельскага РАУС:

— З пачатку года ў раёне ўжо пяць чалавек пазбавіліся сваіх аўто за кіраванне ў п'яным выглядзе. Аднак больш частыя парушэнні — перавышэнне хуткасці і абгон у забароненых месцах. Далёка не ўсе пасябравалі з флікерам. Дробныя парушэнні ПДР у курортнай зоне рэгулярныя, асабліва людзі ігнаруюць правілы паркоўкі і стаянкі ля азёр. Першапачаткова мы людзей ветліва просім адагнаць транспарт і паркавацца ў дазволеных месцах. Калі не дзейнічае — дапамагае эвакуатар. Праблема абвастраецца ў выхадныя дні, калі прыток машын павялічваецца.

Вольга ЧЭМКО, Аляксандр МАРЧАНКА.

ЯК У КАЛОНІІ АЖАНІЦЦА І РАЗВЕСЦІСЯ 4 РАЗЫ?

Для камфорту тут працуе невялічкая крамка, у якой можна набыць мыла і іншыя прадметы асабістай гігіены, цукеркі, печыва, цыгарэты. Кожны асуджаны мае права на 15-хвілін тэлефонных размоў з блізкімі сваякамі за месяц. Для гэтага яны набываюць звычайную тэлефонную картку і звоняць адпаведна графіку, які мае кожны атрад. Працягласць каротказтэрміновага спаткання складае 2 гадзіны, працяглага — 3 дні. Не менш папулярным спосабам камунікавання для асуджаных стала ліставанне з «завочніцамі», аматаркамі знаёмстваў па перапісцы.

— Большасць пакараных пазбаўленнем волі перапісваюцца толькі дзеля таго, каб нечым запоўніць вольны час, — заўважае Аляксандр Таўстуха. — Часам просяць даслаць ім грашовы перавод, а нехта — каўбасу і цыгарэты. Ёсць прыклад зняволенага, які за ўвесь час ліставання афіцыйна жаніўся і разводзіўся разы чатыры! Але ёсць і іншыя сітуацыі. Летась асуджаны знайшоў па перапісцы жанчыну, якая служыць ва Узброеных Сілах, і афіцыйна аформіў з ёй адносіны.

— А як часта ў гэтай калоніі заключалі шлюб?

— Кожны месяц. Праўда, за гэты год у нас толькі адзін падобны выпадак. У нашай установе ёсць аддзел, які адказвае за падобныя цырымоніі. Ён даволі плённа супрацоўнічае з магілёўскім ЗАГСам. Былі нават адведзены асобныя дні тыдня для рэгістрацыі з удзелам асуджаных. І сярод іх ёсць людзі, якія стваралі паўнавартасныя сем'і, а пасля дасылалі фотаздымкі народжаных дзяцей. Многія перад адпраўленнем за краты разрываюць стасункі з сем'ямі, а нехта, наадварот, імкнецца стварыць сям'ю, каб пасля адбыцця тэрміну ведаць, куды паехаць.

Праз пэўны час у пакоях асуджаных заменяць іншыя «жыхары», якіх прымусова адправілі на лячэнне. Праўда, Аляксандр Таўстуха ўпэўнены, што пераўтварэнне калоніі ў ЛПП на структуру не паўплывае.

— Да нас прыедуць людзі, якім неабходна медыка-сацыяльная рэабілітацыя. Менавіта з-за гэтага будзе пашырана медыцынская часць. Сам працэс рэарганізацыі праходзіць бязбольна. Пэўнае хваляванне звязана толькі з тым, што многія атэставаныя супрацоўнікі раней не працавалі з падобнымі людзьмі. Але я мяркую, што з імі працаваць будзе не цяжка. Страшнага нічога няма. Галоўнае, ведаць, як з імі працаваць і выконваць свае абавязкі годна.

Тарас ШЧЫРЫ.
Фота Надзеі БУЖАН.
г. Магілёў.

АПТЫМАЛЬНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ БЕЖАНЦАЎ

Як адзначае Міжнародная арганізацыя па міграцыі, колькасць бежанцаў у свеце павялічваецца з кожным годам. Беларусь таксама ўцягнута ў гэты працэс.

Як адзначыў начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі Аляксей Бягун на канферэнцыі, прысвечанай Сусветнаму дню бежанцаў, статус бежанца ў Беларусі маюць 872 замежнікі. Штогод да нас прыбываюць каля 200 асоб, якія хадайнічаюць аб наданні такога статусу. Найбольшая колькасць хадайніцтваў аб абароне паступала ад грамадзян Афганістана, аднак летась дамінавала Сірыя. Сёлета — Украіна.

З пачатку года 65 грамадзян Украіны звярнуліся ў кампетэнтныя органы Рэспублікі Беларусь з хадайніцтвамі аб наданні статусу бежанца. Акрамя таго, практычна на траціну павялічылася колькасць грамадзян Украіны, якія прыбываюць у нашу краіну для заняткаў аплатнай працоўнай дзейнасцю, а таксама ў мэтах атрымання дазволу на пастаяннае пражыванне ў інтарэсах уз'яднання сям'і. Вяртаюцца этнічныя беларусы, якія раней пастаянна пражывалі на тэрыторыі Беларусі, але ў сілу пэўных акалічнасцяў выехалі на тэрыторыю Украіны.

Сёлета больш як 160 замежнікаў звярнуліся ў органы ўнутраных спраў, а таксама да прадстаўнікоў памежнай службы з хадайніцтвамі аб наданні статусу бежанца. Гэтыя лічбы, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, узраслі на 40%.

Вольга ЧЭМКО.

КРАДЗЯЖОЎ ВЕЛАСІПЕДАЎ СТАЛА БОЛЬШ

У параўнанні з мінулым годам у Беларусі больш як у 1,5 раза павялічылася колькасць крадзяжоў веласіпедаў. Традыцыйны скачок адбыўся з прыходам лета. Агульны ўрон ад названых злачынстваў склаў звыш 2,5 млрд рублёў.

З кожным годам у міліцэйскіх зводках рэгіструецца ўсё менш крадзяжоў (за апошнія 5 гадоў практычна на 50 працэнтаў). Радзей сталі красці з кватэр і прыватных дамоў, арудаваць кішэннікі. Чаго нельга сказаць пра злачынствы, прадметам замаху якіх становяцца веласіпеды. За пяць месяцаў гэтага года зафіксаваны 1 294 факты іх крадзяжоў. Гэта прыкладна на 66 працэнтаў больш, чым у 2013 годзе. Такая тэндэнцыя характэрная для ўсіх рэгіёнаў.

Як правіла, зламыснікі — гэта непрацуючыя, раней судзімыя жыхары гарадоў, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення. Па раніцах і вечарах не крадуць, лічаць за лепшае займацца сваёй здабычай удзень або ўначы. За што, у адпаведнасці з крымінальным заканадаўствам, прыцягваюцца да адказнасці: ад грамадскіх работ да 4 гадоў пазбаўлення волі.

«Асноўная прычына такіх злачынстваў — нядбайнае стаўленне ўладальнікаў да сваёй маёмасці. Большасць крадзяжоў адбылася ў грамадскіх месцах, прасцей кажучы — з вуліцы», — растлумачыў начальнік упраўлення прафілактыкі МУС Алег Каразей.

Алег Георгіевіч рэкамендуе не захоўваць веласіпеды ў пад'ездах і на лесвічных клетках. Пакідаючы ж іх на вуліцы, нават на нядоўгі час, лепш скарыстацца спецыяльнай блакіравальнай прыладай. Пажадана зафіксаваць не толькі раму, але і адно з колаў. Прыназвасці камер відэаназірання старайцеся размясціць веласіпед у зонах іх агляду. Не варта перадаваць двухколавага сябра незнаёмым людзям. Адным з самых эфектыўных спосабаў супрацьдзеяння крадзяжам веласіпедаў з'яўляецца іх маркіроўка, якая ажыццяўляецца спецыялізаванымі арганізацыямі. Акрамя таго, абавязкова перапішыце нумары вузлоў або дэталяў, сфатаграфуйце веласіпед і захоўвайце дакументы аб куплі. У выпадку чаго гэта дазволіць устанавіць яго прыналежнасць.

Віктар НОВІКАЎ.

НАВІНЫ-102 НАВІНЫ-102

■ Пасля службы

МАНЕТА НА ПАМЯЦЬ

Аляксандр Фясько — старшы прапаршчык, памочнік камандзіра ўзвода, камандзір аддзялення групы затрымання Крупскага аддзела аховы — калекцыянуе грашовыя знакі ўжо даўно. У яго зборы — манеты і банкноты розных краін і перыядаў. Аляксандр Уладзіміравіч памятае, як кожны асобнік патрапіў у яго калекцыю, ведае яго гісторыю. Пры ўсім пры гэтым любімай манеты або банкноты ў яго няма — кожная дарагая па-свойму.

Квадратныя, хвалістыя, прамавугольныя...

Апошні раз манеты ў нашых беларускіх кашальках звінелі каля дваццаці гадоў назад, але і яны канулі ў лету разам з савецкай эпохай. Але, як высвятляецца, не для ўсіх. Аляксандр Фясько менавіта з гэтага перыяду стаў калекцыянаваць грашовыя знакі, а разам з тым вывучаць гісторыю, геаграфію і эканоміку.

— Вытокі майго захаплення — у дзяцінстве. Мама працавала ў бібліятэцы, дзе была невялікая калекцыя манет. Я прыходзіў і пастаянна разглядаў яе. Так паступова з'явілася цяга да нумізматыкі, — распавядае Аляксандр. — Пасля распаду Савецкага Саюза ў мяне засталося шмат дробязі, і я вырашыў збіраць манеты па гадах. Спачатку з 1961 па 1991 год, ад капейкі да рубля. Гэта не значыць, што ў калекцыі адна манета капеечная, другая — двухкапеечная... Тады манеты чаканілі кожны год. Таму ў сярэднім па 31 асобніку кожнага наміналу.

Аляксандр Уладзіміравіч адкрывае першы альбом. На кожнай старонцы па кішэньках раскладзены манеты ўсіх наміналаў: ад капейкі да рубля. Капеечных манетак — 31, 30 — дзвюхкапеечных. Цікава, што «пятнаццатак» няшмат. Аказваецца, тыраж гэтых манет заўсёды быў невялікім. Калі капеечныя манеты выпускаліся мільённымі тыражамі і яны былі даступны для ўсіх, то «пятнаццаткі» чаканілі невялікімі тыражамі, і яны разыходзіліся па калекцыях ужо праз год.

Цікава, што кожны асобнік мае дзве характарыстыкі: ступень рэдкасці і калекцыйную цану. Манета, якая не была ў абарачэнні, каштуе даражэй, чым цёмная і пацёртая, на якой практычна нічога не відаць. Бывае, што дробныя дэталі на такіх асобніках ужо не адрозніваюцца, але малюнак усё яшчэ пазнавальны. Чаму ж у такіх выпадках металічны грашовы знак не лічыцца каштоўным? Часта патрэбна дапамога эксперта, каб вызначыць стан манет і правесці іх поўную класіфікацыю.

— Сапраўдныя нумізматы імкнуцца адбіраць з абарачэння грошы новыя, у выдатным стане. Яны стапрацэнтна ўпэўнены, што такія праз пэўны час не выйдуць з абарачэння і кошт іх павялічыцца.

Паўрублі, рублі, траячкі... А вось і пяцірублёвыя. 12 асобнікаў аднаго памера, адзін нашмат большы. Аказваецца, у 1987 годзе да 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі на Ленінградскім манетным двары была выпушчана пяцёрка або «шайба», як яе паміж сабой называюць нумізматы. Па дыяметры яна значна большая за ўсе астатнія: 39,1 міліметра, калі ўсе астатнія — 35. Ды і таўшчыня адрозніваецца — 3,2 міліметра і 2,6 міліметра. Ні да, ні пасля такіх вялікіх манет не выпускалі.

Калі Аляксандр сабраў першую калекцыю, перайшоў да манет, выпушчаных з 1924 па 1961 год. Гэтыя адшукваць было значна цяжэй.

— Да і пасля рэвалюцыі манеты выпускаліся сярэбраныя і медныя. У нейкі момант каштоўныя грошы пачалі знікаць: серабро закопвалі ў зямлю, хавалі, вывозілі... За першыя гады Першай сусветнай вайны з абарачэння ў царскай Расіі знікла манет на 745 мільёнаў рублёў. І так працягвалася да 1931 года, калі па загадзе Сталіна перасталі выпускаць грошы з каштоўнага металу. Таму ёсць манета 1931-га сярэбраная, выпушчаная ў пачатку года, і ёсць нікелевая, чаканкі другой паловы 1931-га, — тлумачыць калекцыянер.

Трэцяя калекцыя Аляксандра Фясько — царскія грошы, выпушчаныя да 1917 года, і першыя паслярэвалюцыйныя. Гэтыя манеты адрозніваюцца і па памеры, і па колеры, і па якасці, і па малюнку. Напрыклад, вось манетка з адтулінай усярэдзіне. Такое адчуванне, што яе выкарыстоўвалі ў якасці ўпрыгажэння. Нумізмату, у якога Фясько набыў гэты асобнік, адна туркменка прынесла маніста. Гэтая манетка і была ў ім. Праўда, паколькі ў «грошыку» прысутнічае брак — дзірка, ён не мае нумізматычнай каштоўнасці.

Асобнікі з выявай Пятра I, Мікалая II... Пры кожным кіраўніку манета змяняла сваё знешняе аблічча. На адных напісана «денга», на другіх — «коп», на трэціх — «капейка». Дарэчы, слова «капейка» ўвайшло ў рускую мову пасля таго, як на манетах пачалі чаканіць выяву вершніка на кані з дзідай у руцэ. Царскія грошы чаканіліся ўручную. Былі і такія, якія перачаканьваліся, мянялі знешняе аблічча. Ужо пазней манеты сталі штампаваць.

Самая старадаўняя руская манета з калекцыі Аляксандра выпушчана яшчэ пры Іване Грозным. Звалася яна «лускавінка». Шведская манета 1609 года выпушчана пры каралі дынастыі Ваза. Знойдзена была ў вёсцы Ігрушка. Адкуль яна ўзялася там? Ніхто не ведае. Але як тлумачыць Аляксандр, гэтая манета недарагая. Іх было выпушчана вельмі шмат, і на рынку яны асаблівай каштоўнасці не маюць. Яна нагадвае кропельку. Тады яшчэ не ўмелі штампаваць круглыя манеты, проста плавілі серабро і капалі ў ваду...

Якіх тут толькі няма манет — квадратныя, хвалістыя, прамавугольныя, сямівугольныя. Безумоўна, найбольш зручныя — круглыя: яны не рвуць кашалькі і кішэні, не колюцца.

У некалькіх альбомах сабраны манеты з усяго свету. Напрыклад, званыя народам «еўрыкі». Гэтыя манеты прынеслі ў нумізматыку шмат цікавага, стаўшы адзіным аплатным сродкам адразу для 12 краін Еўрасаюза. Манеты выпушчаны ў васьмі наміналах. Дык вось, дызайн аверса ў іх аднолькавы. На трох самых дробных цэнтах намалявана карта свету. На 10, 20, 50 цэнтах — контуры еўрапейскіх дзяржаў. А на знаках у 1 і 2 еўра — Еўропа без межаў.

— Да з'яўлення еўра жыхары Старога Свету паставіліся далёка не адназначна. Каб захаваць нацыянальныя традыцыі, вырашылі пакінуць за кожнай краінай Еўрасаюза права ўпрыгожваць манету на свой густ, з улікам мясцовых асаблівасцяў. Гэтым правам скарысталіся ўсе краіны без выключэння. Месцы нараджэння еўра вызначаюцца па марках манетных двароў, — працягвае аповед Аляксандр. — Цікавая дэталь, якая ўжо прыцягвае ўвагу калекцыянераў: той, хто жадае сабраць еўраманеты Германіі па разнаваднасцях, вымушаны будзе пакласці ў калекцыю не 8, а 40 асобнікаў. Справа ў тым, што гэтыя манеты чаканіліся адначасова ў пяці гарадах.

Калі, дапусцім, вам у Францыі давядзецца трымаць у руках еўраманету, паглядзіце, у якой краіне яна была выпушчана. Магчыма, яе прывезлі з Эстоніі або Люксембурга.

Гаварыць з Аляксандрам пра яго двухтысячную калекцыю манет, а тым больш разглядаць гэты збор можна цэлы дзень, а то і даўжэй. Гэты занятак захоплівае. Хоць, як прызнаецца сам суразмоўца, калі ўпершыню патрапіў у Мінскі клуб калекцыянераў, зразумеў, што яго збор — не самы буйны.

«ПяцьдзЕсят рублёў» і «ПяцьдзЯсят рублёў»

Да альбомаў з манетамі мой суразмоўца дадаў яшчэ некалькі, толькі ўжо з папяровымі грашыма. Яны займаюць сваё месца ў калекцыі Аляксандра. Тут ёсць царскія, савецкія, замежныя купюры. Вось банкноты з малюнкам Кацярыны II, Аляксандра III, Мікалая I і Мікалая II, Аляксея Міхайлавіча. Пяцісотрублёвая купюра 1912 года з выявай Пятра I і Кацярыны II была памерам з палову альбомнага ліста. Цяпер уявіце, якім жа тады быў кашалёк...

— Цікава тое, што лягчэй знайсці валюту далёкіх краін, чым, напрыклад, Кыргызстана, Узбекістана або Малдовы, — гаворыць Аляксандр. — Паглядзіце на кітайскія банкноты. Яны зроблены з плёнкі, не камечацца, не рвуцца, з празрыстымі ўстаўкамі, дзе пазначаны намінал. А вось грошы Маўродзі. Памятаеце фінансавую піраміду МММ?

Ёсць тут і купоны, і карткі, і беларускія «зайчыкі»... Нашы сучасныя беларускія рублі. Яшчэ ў 2010 годзе яны былі без бліскучай перарывістай палоскі, з 2011 года — з ёй. Цікавыя беларускія банкноты 2000 года: «ПяцьдзЕсят рублёў» і «ПяцьдзЯсят рублёў». Адрозніваюцца адной літарай, апярэдзілі змены ў арфаграфіі, зацверджаныя ў 2008 годзе. І зноў прамашка: гэтыя грошы друкавалі ў Расіі на беларускай мове.

У Крупскім РАУС збіраннем манет, акрамя Фясько, займаецца ўчастковы інспектар міліцыі Сяргей Ермаловіч. Калекцыю юбілейных манет перыяду СССР сабралі памочнік дзяжурнага РАУС Уладзімір Часновіч і начальнік раённага аддзела Следчага камітэта Андрэй Рабовіч. Усе пералічаныя супрацоўнікі — члены раённага аматарскага аб'яднання «Скарбонка», якое існуе ўжо больш як тры гады. За гэты перыяд прадстаўнікі клуба наведалі школы горада і раёна, удзельнічалі ў гарадскіх мерапрыемствах і ў Крупках, і ў Беразіно.

Ігар ШАЛАУМАЎ

■ Ведай нашых!

ПАРЫЖ ВІТАЎ КУПАЛАЎЦАЎ

«Пан Тадэвуш» вярнуўся туды, дзе нарадзіўся

...Прафесар Міцкевіч чытае лекцыю. Гаворыць пра тое, што добра ведае: пра людзей і іх мову, пра радзіму і асаблівую культуру. І гэта так далёка ад яе — у іншым горадзе, у чужой краіне. Яго словы нехта прымае глыбока да сэрца. Юная студэнтачка разумее, пра што славуты выкладчык разважае ў Францыі. Яна разумее, таму што тое, што жыве ўнутры чалавека — яго культурная прыналежнасць — не разбураецца з пераменай месца жыхарства. Яна прарываецца, дзе б ты ні жыў, кім бы ні быў, яна не праходзіць і не гіне нават тады, калі знікае назва краіны і нібыта няма сэнсу гаварыць і разважаць пра яе народ. Культурны код чалавек нясе з сабою. Ён можа і не дажыць да таго часу, які ўсё расстаўляе па месцах і па коле вяртае ідэі і думкі, скіроўваючы людзей да аднаўлення справядлівасці. Але той, хто верыць і служыць думкамі і справамі, перамагае (можа, і пасля смерці), і дакладна не сыходзіць у нябыт: таму што дбаў пра вечнае. Так пачынаецца спектакль Купалаўскага тэатра «Пан Тадэвуш» (рэжысёр Мікалай Пінігін), прэм'ера якога адбылася ў Беларусі на пачатку 2014 года.

Наш славуты тэатр паказаў спектакль паводле Міцкевіча ў Парыжы — і выклікаў ажыятаж. Тое, што Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Янкі Купалы ездзіць з гастролямі па розных краінах — не дзіва: ён умее прадставіць вобраз Беларусі на сцэне. Але факт паказу спектаклю «Пан Тадэвуш» паводле Адама Міцкевіча ў Парыжы — момант гістарычны. Менавіта там на пачатку 30-х гадоў XIX стагоддзя пісалася гэтая паэма.

Не так далёка той Парыж, калі разабрацца: тая ж Еўропа. Горад свабоды і горад свабодных аказаўся блізкі па духу Адаму Міцкевічу, які шукаў прыстанку пасля таго, як на радзіме для яго — патрыёта Літвы — не было месца. Не стала той, яго Літвы. За думкі і мары пра яе каралі, а тое і наогул пазбаўлялі жыцця. Ён ратаваўся ў творчасці. Але і творчасць трэба было ратаваць: паэту неабходна было знайсці месца, дзе ён можа жыць і працаваць, жыць і пісаць, жыць і любіць сваю радзіму. Шукаў доўга — спачатку ездзіў па Расіі, потым рушыў у Еўропу — Германію, Швейцарыю, Італію. Ён знайшоў месца, дзе ўсё сышлося: Францыю. Пасяліўся спачатку ў Парыжы, і адтуль любоў да той яго радзімы, пра якую ўсе пачалі забываць, загучала на ўсю Еўропу. Менавіта ў паэме «Пан Тадэвуш», якая пісалася ў 1832-1834 гадах у Парыжы і нават была там выдадзена.

Вядома, калі ёсць такі твор, які аб'ядноўвае беларускую (у часы Міцкевіча — літоўскую, паводле назвы гістарычнай дзяржавы) і французскую культуру сёння, то яго варта паказваць у рамках Дзён культуры. Але паказ спектакля паводле Міцкевіча сімвалічны: сёлета роўна 180 гадоў гэтаму твору, народжанаму на французскай зямлі! Паказ спектакля быў арганізаваны Пасольствам Беларусі ў Францыі і ўпершыню адбываўся пад патранатам ЮНЕСКА (гэта цудоўная паэма стала з'явай у сусветнай літаратуры, яна перакладзена больш чым на 30 моў свету, у тым ліку і на французскую). На паказе прысутнічала больш за 600 чалавек. Сапраўды, Міцкевіч варты аншлагу. Цудоўная паэма, якая распавядае пра жыхароў Навагрудка і іх патрыятычныя памкненні, вартая аншлагу. І наш тэатр з яго выдатнымі артыстамі варты аншлагу.

Яны ігралі па-беларуску (для пастаноўкі Язэпам Семяжонам быў зроблены пераклад з польскай мовы, на якой напісана паэма). Іх разумелі па-беларуску: прадстаўнікі нашага пасольства ў Францыі і прадстаўнікі беларускай дыяспары, людзі, якія таксама, як і Міцкевіч некалі, хочуць памятаць пра свае карані. Але разумелі і грамадзяне Францыі: дыпламаты і грамадскія дзеячы, асобы культуры (для іх ішлі французскія субтытры, тэкст якіх створаны Рабэрам Буржуа). Цікава і тое, што паказ беларускага спектакля адбыўся ў тэатры МС93, у зале імя расійскага рэжысёра Алега Яфрэмава. Але ўпершыню на парыжскай сцэне прадстаўлены спектакль беларускага рэжысёра.

Адметны яшчэ адзін момант: купалаўцы і іх «Пан Тадэвуш» паказалі ў Парыжы Беларусь без выкарыстання бюджэтных сродкаў. У арганізацыі такога важнага і гістарычнага праекта для нашай краіны дапамагалі беларускія і французскія мецэнаты, прадстаўнікі бізнесу. Значыць, ёсць зацікаўленасць і ў культурным сяброўстве сярод эліт нашых краін.

І гэтая з'ява таксама, можа быць, ідзе з даўніх часоў. Французыя дапамагла ў цяжкі момант цудоўнаму паэту Міцкевічу. Дала не толькі прыстанак, але і працу: ён стаў нават першым прафесарам славянскай славеснасці ў Каледж дэ Франс. Выдатнага паэта-рамантыка тут шануюць дагэтуль: на парыжскай плошчы Альмы, на ўзбярэжжы Сены, ёсць помнік Міцкевічу. Да яго з кветкамі прыйшлі ўсе, хто датычны да гэтай тэатральнай французска-беларускай падзеі: пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка, дыпламаты пасольства, а таксама артысты Купалаўскага тэатра на чале з мастацкім кіраўніком Мікалаем Пінігіным.

Героі паэмы «Пан Тадэвуш» — маладыя людзі, якія дбаюць пра інтарэсы сваёй радзімы (кожны ў сілу сваіх магчымасцяў). Шляхта з-пад Навагрудка жыве сваімі інтрыгамі, крыўдамі, планамі. Але ўсе яны адыходзяць, калі ёсць пагроза таму, што ўсіх яднае. Усе яны хочуць жыць на адной зямлі. Усе яны яе любяць і гатовыя ахвяраваць сабой. Разуменне патрыятызму ў XXI стагоддзі не змянілася — ні ў Францыі, ні ў Беларусі. Авацыі — Міцкевічу!..

Ларыса ЦІМОШЫК ■

Мікалай ПІНІГІН, рэжысёр-пастаноўшчык спектакля «Пан Тадэвуш», падзяліўся ўражаннямі ад парыжскай пастаноўкі:

— Умовы для акцёраў былі не зусім звыклыя. Напрыклад, галасы ў час спектакля трэба было накіроўваць уверх на амфітэатр, бо сцэна ў тэатры МС93 на адным узроўні з глядзельнай залай. Але ў гэтым была і своеасаблівая задача, якую мы жадалі вырашыць лепшым чынам. Зала была запоўнена і настроена на сустрэчу з беларускімі артыстамі. Здавалася, усе разумелі значэнне таго, што адбываецца: праз 180 гадоў пасля напісання ў Парыжы вялікай паэмы вялікім выгнанцам Адамам Міцкевічам яна прагучала на парыжскай сцэне! Гістарычная падзея.

Можна сказаць, што сапраўды атрымаўся аншлаг і фурор! Апладысменты не змаўкалі доўга, артысты тройчы выходзілі на паклон. Распешчанага французскага гледача мала чым можна здзівіць, аднак сярод публікі было шмат французаў. Былі і нашы суайчыннікі, а таксама студэнты-славісты. Беларусь выклікае цікавасць у Заходняй Еўропе, а тое, што беларусы прывезлі спектакль паводле паэмы свайго земляка Адама Міцкевіча, выклікала вялікую цікавасць да нашай культуры.

Запісала Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

ЗАВЕРЕНО
Директором Департамента
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
Сушко С.А.
20.06.2014

Паритетбанк
www.paritetbank.by

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательным Советом
ОАО «Паритетбанк»
23.05.2014, протокол № 9

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ десятого, одиннадцатого, двенадцатого выпусков ОАО «Паритетбанк»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках):
На белорусском языке:
полное – Адкрытае акцыянернае таварыства «Парытэтбанк»;
сокращенное – ААТ «Парытэтбанк».
На русском языке:
полное – Открытое акционерное общество «Паритетбанк»;
сокращенное – ОАО «Паритетбанк».

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail):
Юридический и почтовый адреса: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Киселева, д. 61а;
телефон: (017) 288 63 31, факс: (017) 288 63 31;
e-mail: info@paritetbank.by.

3. Номера расчетного и валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи:
Денежные средства при проведении открытой продажи облигаций ОАО «Паритетбанк» (далее – облигации) будут зачисляться на следующие счета:
от открытой продажи десятого выпуска счет 4940800010108 в ОАО «Паритетбанк», код 782, УНП 100233809;
от открытой продажи одиннадцатого выпуска счет 4940800010124 в ОАО «Паритетбанк», код 782, УНП 100233809;
от открытой продажи двенадцатого выпуска счет 4940800015028 в ОАО «Паритетбанк», код 782, УНП 100233809.

4. Наименование периодического печатного издания, определенное эмитентом для раскрытия информации, сроки ее публикации:
Бухгалтерская отчетность эмитента публикуется в газете «Звязда» ежеквартально не позднее тридцати календарных дней после окончания отчетного квартала, ежегодно не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.
Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента публикуется в газете «Звязда» и в журнале «Юстиция Беларуси», информация о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) публикуется в газете «Звязда» в сроки, установленные соответствующими решениями уполномоченного органа эмитента, а также в порядке, определенном законодательством.
Информация о внесенных изменениях в проспект эмиссии облигаций публикуется в газете «Звязда» не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства Республики Беларусь.
С данной информацией можно ознакомиться также на сайте эмитента по адресу: www.paritetbank.by.

5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его место нахождения, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия специального разрешения (лицензии):
Наименование депозитария: депозитарий ОАО «БПС-Сбербанк».
Юридический и почтовый адреса: 220005, г. Минск, бульвар В. Мулявина, 6.
Дата и номер государственной регистрации: зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 года за № 25.
Специальное разрешение (лицензия) Министерства финансов Республики Беларусь № 02200/5200-1246-1086 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь за № 5200-1246-1086, действительна по 30.01.2022 года.

6. Размер уставного фонда эмитента:
Уставный фонд Банка составляет 328 368 435 201 (Триста двадцать восемь миллиардов триста шестьдесят восемь миллионов четыреста тридцать пять тысяч двести один) белорусский рубль.

7. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа его зарегистрировавшего:
Банк зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 15 мая 1991 г., регистрационный №5.
Банк учрежден в форме открытого акционерного общества решением Собрания пайщиков Коммерческого банка «Поиск» 12.03.1992 (Протокол №1). Решением Собрания акционеров от 23.03.2000 протокол №1, переименован в ОАО «Банк «Поиск» (изменения зарегистрированы Национальным банком Республики Беларусь 21.11.2000, регистрационный №5). На основании решения Собрания акционеров от 26.03.2004 протокол №2, переименован в ОАО «Паритетбанк» (изменения зарегистрированы Национальным банком Республики Беларусь 05.05.2004, регистрационный №5).

8. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям:
Выпуски облигаций осуществляются по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь, постановление Правления от «03» июня 2014 № 368, в пределах 80 процентов нормативного капитала в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 года № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

9. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение:
Решения о десятом, одиннадцатом, двенадцатом выпусках облигаций Банка в соответствии с Уставом приняты Наблюдательным Советом Банка 23.05.2014, протокол № 9.

10. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций:

